Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 49 (2899) Год LVI | Беласток, 4 снежня 2011 г. | Цана 2,50 зл. (у тым VAT 5%)

Ганьба ўладам. Гонар нацыі!

Алесь Бяляцкі↑ Мікола Статкевіч↓

Зміцер Дашкевіч↑ Павал Севярынец↓

Андрэй Саннікаў↑ Уладзімір Някляеў↓

Зміцер Бандарэнка↓

Яўген ВАПА

Завяршыўся суд над Алесем Бяляцкім. Прыгаварылі яго да канфіскаты маёмасці і 4,5 года пазбаўлення волі ў турме з абвостраным рэжымам толькі за-тое, што сам Алесь і кіраваны ім Праваабарончы цэнтр „Вясна" кінуў выклік антыдэмакратычнай і антызаконнай сістэме Аляксандра Лукашэнкі. А гэтага дыктатар не пераносіць. Тым самым Алесь Бяляцкі папоўніў доўгі спісак палітычных вязняў, якія зараз адбываюць пакаранні і пераносяць рэпрэсіі ў самой Беларусі. Апынуўся ён у ліку тых, каго сам абараняў. Варта нагадаць, што Алесь Бяляцкі з'яўляецца шматгадовым чытачом нашага тыднёвіка і сябрам рэдакцыі. Калі менавіта ў 2004-2006 гадах ішоў прыдуманы працэс над „Нівай", то прадстаўнікі „Вясны" і іншых беларускіх пазаўрадавых арганізацый сарганізавалі маштабную, міжнародную акцыю ў абарону нашай рэдакцыі. Сам Алесь Бяляцкі ўжо як прызнаны аўтарытэт пра нашую справу і яе раздзьмуханасць гаварыў у час важных сустрэч з прадстаўнікамі польскіх і еўрапейскіх структур. Мы, пры існаванні незалежнага правасуддзя, выйгралі менавіта дзякуючы і той беларускай салідарнасці. У нашай справе маўчалі тады афіцыйныя беларускія ўлады і іх дыпламатычныя прадстаўніцтвы.

А зараз маем змрочны лістапад і амаль гадавы працяг крывавай расправы над беларускім грамадствам з часу прэзідэнцкіх выбараў 19 снежня 2010 г. Варта ўспомніць, што ў гэты дзень была крывава разагнаная мірная дэманстрацыя ў цэнтры Мінска, было арыштаваных пад тысячу людзей, у тым ліку амаль усе кандыдаты на пасаду прэзідэнта. Некаторыя з іх, як Алесь Міхалевіч, пасля выхаду з арышту, у якім праводзіўся над ім фізічны і маральны здзек, паспелі збегчы за мяжу. Іх „віна" толькі ў тым, што яны хацелі толькі, і аж толькі, незалежнай беларускай дзяржавы з беларускай мовай і духам, у якой вырашальны голас маюць усе грамадзяне краіны ў час дэмакратычных выбараў. Перад Вамі, шаноўныя чытачы, здымкі некаторых „ворагаў народа". Спаглядаюць на нас разумнымі вачыма тыя, якія адчуваюць адказнасць за будучыню краіны, а не тыя, у каго страх у вачах і кроў на руках.

Вось **Андрэй Саннікаў**, кандыдат у прэзідэнты, дыпламат, былы віцэміністр замежных спраў Беларусі, жорстка збіты і прысуджаны да пяці гадоў абвостранай калоніі. Зараз часта этапаваны з аднаго горада ў другі, у холадзе, без яды, хворы. Жонка Ірына Халіп, вядомая журналістка, таксама арыштаваная 19 снежня, звычайна па-жаночаму вельмі баіцца за жыццё мужа Андрэя. Яно ў небяспецы, — сцвярджае яна. Калі іх абое арыштавалі, іх малым сынам займаліся бабуля з дзядулем. Тады ўладам мільганула нават думка адабраць сям'і дзіця і адправіць яго ў дзіцячы дом.

Чарговы кандыдат **Мікола Статкевіч** — сацыял-дэмакратычны палітык, прысуджаны да шасці гадоў зняволення ў калоніі. Раней ужо таксама караны пабыўкай у працоўнай калоніі. Адстаўны палкоўнік арганізаваў Беларускае згуртаванне вайскоўцаў і прымаў у 1992 г. першую прысягу беларускіх афіцэраў на вернасць Беларусі. У калоніі, нягледзячы на кантузію рукі, прымушаны працаваць на лесапілцы. Зараз яму і яго грамадзянскай жонцы адмаўляецца ў сустрэчах і шлюбе.

працяг ☞4

Уладзімір НЯКЛЯЕЎ

Сцяг

Лунае, нескароны,
На векавых вятрах
Наш, ад крыві чырвоны,
Ад болю белы, сцяг.
Наш бел-чырвона-белы,
Нябесны, вольны, смелы,
Наш бел-чырвона-белы,
Сцяг,
Сцяг,
Сцяг.

Айчына, Бог і Гонар,
Малітва на губах,
Крывіцкая Пагоня
Нясе наш вольны сьцяг.
Наш бел-чырвона-белы,
Нябесны, вольны, смелы,
Наш бел-чырвона-белы,
Сцяг,
Сцяг,
Сцяг.

Пагоню не спыняе
Не боль, не кроў, не страх
І над крывіцкім краем
Як птах лунае сцяг.
Наш бел-чырвона-белы,
Нябесны, вольны, смелы,
Наш бел-чырвона-белы,
Сцяг,
Сцяг,
Сцяг.

2010 г.

Асуджаны ў маскоўскім судзе

„Праваабарончай дзейнасцю, і наогул грамадскай дзейнасцю, я займаюся практычна ўсё маё жыццё. Пры такой кепскай сітуацыі, якая склалася ў краіне перманентна на працягу апошніх гадоў, натуральна, што крымінальны пераслед мог пачацца ў любую хвіліну, у кожны год. І тое, што магло адбыцца — адбылося. Таму я не шкадую ні аб адным сваім кроку, зробленым за гэтыя 30 гадоў у плане абароны дэмакратыі, правоў чалавека ў Беларусі. Я гэта рабіў свядома".

Такімі словамі закончыў сваю прамову ў судзе вядомы ў Беларусі і ва ўсім цывілізаваным свеце беларускі праваабаронца Алесь Бяляцкі. Ён сам назваў сваю прамову і выступ свайго адваката лямантам адзінокага ў пустыні. Праваабаронца не сумняваўся, што прысуд па ім ужо даўно вынесены. І нічога не зменяць ні довады абароны, ні ягоныя тлумачэнні. Таму ён прамаўляў не для іх, хто яго асуджваў, а для тых, у чыёй змозе яшчэ адстойваць агульначалавечыя ідэалы, еўрапейскія каштоўнасці і змагацца за незалежнасць і будучыню свабоднай дэмакратычнай Беларусі, у якой правы чалавека будуць шанаваць і бараніць не толькі грамадскія праваабаронцы, але і дзяржаўныя інстытуты.

Да гэтага выступаў адвакат, які раіў звярнуць увагу не толькі на поўную адсутнасць доказаў віны, але і на постаць абвінавачваемага, якога двойчы наміноўвалі на Нобелеўскую прэмію міру, які атрымаў шматлікія прэстыжныя прэміі ды ўзнагароды. Яму аднадумцы і паплечнікі на Радзіме і за яе межамі даверялі кіруючыя пасады, як доказ прыстойнасці, чэснасці ды бескарыснасці гэтага чалавека. Яго, нашага суайчынніка, абралі ганаровым грамадзянінам італьянскага горада Генуя. І яшчэ мноства ўсяго, што падштурхоўвала кожнага патрыёта ганарыцца такім суайчыннікам, як Алесь Бяляцкі.

Чатыры з паловай года калоніі строгага рэжыму з канфіскацыяй маёмасці. Такі быў вырак суда. Беларускага літаратара, дысідэнта, праваабаронцу, змагара за праўду асудзілі ў судзе з назвай Маскоўскі. Ёсць нейкі сімвалізм у гэтым. Яго, беларускамоўнага патрыёта, судзілі па-руску, хоць той і патрабаваў весці працэс на роднай мове. Ды хіба не знайшлося па ўсёй Беларусі аніводнага суддзі, аніводнага пракурора, і ні адной сакратаркі, якія б ведалі нашу мову, і якіх можна было б дапусціць да гэтага працэсу. І гэтым сказана ўсё. І пра сітуацыю ў краіне ў цэлым, і пра сістэму, і канкрэтна пра гэты працэс.

А вось асуджаныя ўсё часцей беларускамоўныя. Тым больш цынічнымі і бязлітаснымі выглядаюць выракі над імі.

Калі сядзіш у судовай зале, дзе абвінавачваемы гаворыць па-нашаму, а ўсё людзі ў мундзірах розных колераў, з рознымі пагонамі, і тыя, хто ахоўвае абвінавачваемага, і тыя, хто мусіць забяспечыць парадак, і тыя, хто абвінавачвае, гавораць па-іншаму, не пакідае ўражанне поўнай акупацыі. Гэтае пачуццё з'яўляецца адразу як падыходзіш да будынка суда. Міліцыя не толькі правярае і перапісвае дакументы кожнага, хто хоча трапіць на працэс, але і аглядае кішэні, залазіць пад вопратку, не прапускае людзей з сімволікай і ў непажаданай, на іх думку, вопратцы. Не дазваляюць зайсці у майцы з партрэтам Алеся Бяляцкага і ўвогуле мець пры сабе ягоны партрэт у папяровым выглядзе. Пасля яшчэ адзін кантроль. Пасля здымаюць на камеру. І зноў перапісваюць. А ля будынка суда стаіць аўтазак. А самога абвінавачваемага прывозяць з уключанымі мігалкамі.

І таму справу над Алесем Бяляцкім назвалі палітычна матываванай не толькі ён і яго адвакат ды паплечнікі. Па ўсім цывілізаваным свеце на ўсіх роўнях пракацілася хваля з патрабаваннямі вызвалення беларускага праваабаронцы. І гэтая хваля нарастае. А ён, са сваёй спакойнай усмешкай, проста і даходліва патлумачыў сэнс свайго змагання: „(...) мы паказваем, што ў Беларусі ёсць нармальныя людзі, людзі, якія разумеюць, што такое правы чалавека, што такое дэмакратыя. І ў будучыні, я думаю, ніхто не зможа сказаць, што ў гэтыя складаныя для Беларусі часы ніхто ў краіне нічога не рабіў. Я мяркую, што мы шмат у чым ратуем гонар беларусаў на сённяшні дзень і надалей будзем рабіць гэта ў любых умовах, дзе б мы не знаходзіліся — на волі або ў турме".

Віктар САЗОНАЎ

Б'ем на трывогу!

Мастацтвам утыркнуць палку ў мурашнік Яраслаў Качынскі авалодаў выдатна. Калі Еўропа звіваецца ў спазмах эканамічнага крызісу, а ў Польшчы ідзе нялёгкая дыскусія аб дзяржбюджэце і яго ўрэзванні-ўгібанні на меру як найбольш рэальнай гаспадарчай катастофы і то на глабальным узроўні, лідар ПіС ініцыюе чарговы скандал. Тым разам за вяртанне пакарання смерцю. Колькі такіх тузоў... прабачце, ядавітых гадзюк мае ён яшчэ ў сваім рукаве? Дарэчы, спасылаючыся на гісторыю Рымска-каталіцкага касцёла, які ад пачатку сваёй гісторыі змагаецца з тэалагічна супярэчлівымі паняццямі божай і людскай справядлівасці, і таму не заўсёды моцным голасам абараняе права чалавека на жыццё, старшыня ПіС ублытаў гэтую шаноўную ўстанову ў авантурысцкі дыскурс. Вось ён заяўляе, што Касцёл не да канца супраціўляецца пакаранню смерцю. Ну, дык пабачым, што на гэта скажуць іерархі. Калі набяруць вады ў рот, яшчэ больш паглыбляцца польскія антаганізмы. Ды, мабыць, таго і трэба Качынскаму. Разбітае і перасваранае на шматлікіх узроўнях грамадства лягчэй сапхнуць на край прорвы. А тады: „Хто не хоча прапасці, няхай ідзе за мною!". Калісь беларусы пайшлі за сваім крыклівым збаўцам... і куды дайшлі?

Я не ведаю, колькі жыхароў Беларусі займае працэс Зміцера Канавалава і Уладзіслава Кавалёва, абвінавачаных у арганізаванні тэрактаў у 2008 г. і ў мінскім метро 11 красавіка 2011 г., у якіх загінула 15 чалавек. А справа вельмі сур'ёзная. Пагражае ім пакаранне смерцю. І хаця б таму трэба ёю старанна заняцца.

Пакаранне смерцю кепска ўплывае на дабрастан грамадства і, што горшае, шмат нявырашаных пытанняў, істотных для яго глыбокага агляду, няўхільна закрывае. Перш за ўсё выкананне пакарання праведзенага ў імя закону санкцыянуе яго бяссільнасць перад чалавечай натурай, дарэчы, надалей неазначальнай. Чалавек з'яўляецца не да канца свядомым сябе самога тут і цяпер індывідам. Ягонымі паводзінамі кіруюць не толькі інтэлектуальныя выбары, не толькі эмоцыі, але таксама і складаныя і незалежныя ад яго біяхімічныя рэакцыі на малекулярным узроўні. Не ведаем, наколькі яны фармуюць чалавечую псіхіку, наколькі ўплываюць на тыя ці іншыя эмоцыі, такое ці іншае бачанне рэчаіснасці. У сапраўднасці нічога не ведаем. Як кажа знакаміты біякібернетык праф. Ян Тромбка, разумеем, якая ёсць натура электрычных імпульсаў, абягаючых нейтронную сетку мозгу, ды надалей не разумеем, як яны становяцца ўявай, напрыклад, аплываючай тлушчам кілбасы. Вось што! А таго чаго мы не ў змозе канчаткова зразумець, не павінны катэгарычна і незваротна асуджваць. Бо наколькі чалавек, які, напрыклад, даспяваў у сацыяпатычным ці псіхапатычным асяроддзі, адказвае за свае дзеянні, а наколькі само грамадства, якое адмаўляецца адказнасці за адбываючыеся на яго перыферыях паталогіі? Застаецца яшчэ праблематычная справядлівасць, настолькі недасканалая, наколькі недасканалым з'яўляецца чалавек. Прытым надалей здараюцца памылкі. Бывае таксама так, што карумпаваныя суддзі становяцца выканаўцамі пакаранняў палітычных судовых прысудаў.

30 лістапада мае быць вынесены прысуд Канавалаву і Кавалёву. Першы з іх не скарыстаў права на сваё апошняе слова. Другі рашуча запярэчвае, што меў дачыненне да абвінавачанняў, сцвярджаючы, што ранейшыя, абвінавачваючыя яго паказанні, вымусілі на ім следчыя. Прызнаўся затое да ўзарвання... петарды. У нейкім пад'ездзе. Калі было яму 15 гадоў.

На шчасце, чуюцца ўжо крытычныя галасы, сумняваючыеся ў сумленнасць расследавання, а нават паказваючыя на спецслужбы, што падначаленыя сыну прэзідэнта Лукашэнкі, Віктару, які, кажуць, меў даць загад правесці красавіцкі замах у мінскім метро ды той у 2008 годзе. І штосьці ў гэтым ёсць. Няма лепшага апраўдання, каб яшчэ мацней схапіць за морды непакорную меншасць беларусаў, чым пераканаць апошнюю большасць, што яе бяспецы пагражаюць тэрарысты. А такіх няцяжка знайсці і пасля ў велічы закону ліквідаваць іх як нявыгадных сведкаў працэсавых махлярстваў. Так ці інакш Аляксандр Лукашэнка патрабуе для меркаваных злачынцаў „як найвастрэйшага пакарання". А гэтае пакаранне выконваецца ў Беларусі стрэлам у патылічу. Каб і нас, так як і рук ката, не абрызгалі іх мазгі! Б'ем усе на трывогу! Колькі сілы!

Міраслаў ГРЫКА

Вачыма еўрапейца

Такія галошы!

Маем ужо ўрад, прэм'ер Дональд Туск у Сейме абвяшчае сваё экспазе, прысвечанае выключна гаспадарцы, а нацыянальныя і этнічныя меншасці трапілі пад апеку новага ведамства і новага міністра. Так вось за справы м.інш. беларусаў адказваць будзе міністэрства адміністрацыі і аблічбовак (МАіА) з Міхалам Бонім на чале. Міністр Боні гэта ў 1980-1989 гадах дзеяч „Салідарнасці", а ў 1991 г. міністр працы і сацыяльнай палітыкі. У студзені 2009 г. стаў ён міністрам-членам Рады Міністраў, а раней дзяржсакратаром у Канцылярыі прэм'ера. Усё паказвае на тое, што пытанні меншасцей будуць у далейшым коле яго зацікаўленняў, а займацца імі будуць тыя самыя чыноўнікі МУСіА. Міністр Боні ўжо дэкларавуўся:

— Абсалютным прыярытэтам для мяне з'яўляецца паправа якасці паслуг адміністрацыі. Адначасова дзякуючы камп'ютарызацыі публічных паслуг можна будзе абмежаваць лік чыноўнікаў.

Гаварыў таксама аб даручаных яму прэм'ерам заданнях:

— Галошы, дапамога людзям, дарогі, памяшканні, „схетыноўкі", канфесіі, нацыянальныя меншасці, Супольная камісія ўрада і епіскапату, гэта ўсё — у мяне.

На маю думку, меншасці не будуць непасрэдна міністру Боні нейкай „праблемай". Для прыкладу адной — як гэта назвала адна з газет — з гарачых бульбін, якую яму падкінулі, будзе пытанне прадбачанае ў экспазе прэм'ера — уключэнне духавенства у агульную сістэму сацыяльнага страхавання. Тым не менш Міхала Боні пазналі ўсе як палітыка з сацыяльнай уражлівасцю. Так вось у крызісных сітуацыях меншасці змогуць і непасрэдна на яго разлічваць.

Амаль зараз пасля таго як было створана наша ведамства, увядзенне новага раскладу язды прадказала суполка ПКП Рэгіянальныя перавозы (не мае гэта сувязі са стварэннем МАіА). Толькі да 10 снежня маюць ездзіць дзве пары цягнікоў Чаромха — Высока-Літоўск і дзве з Кузніцы-Беластоцкай у Гродна і адна пара з Беластока ў Гродна. Вядома, так як і ў іншых выпадках, датычных ліквідаваных цягнікоў, і аб гэтых, кажуць, вырашаюць эканамічныя пытанні. Калі я папрасіў Рэнату Герасімюк, прадстаўніцу Падляшскай установы Рэгіянальных перавозаў, каб пераслала інфармацыю аб колькасных паказчыках перавозу пасажыраў на шляху Беласток — Гродна і назад, адпісала, што гэта камерцыйная тайна. Я сумняваюся ў тым, ці гэта праўда. З інфармацыі, якую я атрымаў у Падляшскай часці Памежнай аховы вынікае, што заціўкаўленне перасяканнем мяжы на чыгунцы на шляху Беласток — Гродна і Гродна — Беласток — вельмі вялікае. Прыкладна: ад 19 331 асобы ў маі да 24 833 асоб у кастрычніку. У сярэднім у месяц у мінаючым годзе вагалася яно на ўзроўні 21 тысяч пасажыраў. Можна затым меркаваць, што само пытанне колькасных паказчыкаў перавозу пасажыраў цягнікамі, прынамсі на шляху Беласток — Гродна, не з'яўляецца прычынай ліквідацыі гэтага маршруту. Дык што з'яўляецца прычынай? Я папрасіў даць каментар у падляшскага маршалка Яраслава Дважанскага (ваяводскі самаўрад фінансуе рэгіянальныя маршруты).

— Міністр транспарту павінен звярнуць большую ўвагу на гэты элемент чыгуначных маршрутаў, паколькі самаўрад Падляшскага ваяводства, высылаючы цягнікі ў Гродна і Высока-Літоўск, кіруе іх за мяжу Еўрасаюза. Гэта міжнародныя маршруты, хаця яны прыгранічныя, і павінны быць так міністэрствам трактаваныя і фінансаваныя. Партнёр з беларускага боку не ў змозе фінансаваць нам выкананай перавознай працы, значыць, мы нясем кошты „ў адзіночку". Стараемся пераканаць міністра транспарту, каб фінансаваў гэтыя маршруты.

— А калі не дасць згоды? — дапытваўся я.

— Пакідаю гэтае пытанне адкрытым.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

У Нарве пад імем архіепіскапа МІРАНА

У Нарве ў школьна-дашкольным комплексе 21 лістапада адзначылі першыя ўгодкі з дня прысваення гімназіі імя патрона, архіепіскапа, дывізійнага генерала Мірана Хадакоўскага, земляка і духоўнага апекуна Гайнаўскай зямлі. Уладыка Міран загінуў у авіякатастрофе прэзідэнцкага самалёта пад Смаленскам 10 красавіка 2010 г. Сям'я ягонай маці Марыі паходзіць з Качалаў, а бацькі Яна — з суседняй вёскі Крыніца ў Нараўчанскай гміне. Быў ігуменам манастыроў у Яблачыне і Супраслі (аднавіў Благавешчанскі манастыр), выкладчыкам — доктарам тэалогіі, гайнаўскім архіепіскапам, кіраўніком Праваслаўнага ардынарыята Войска Польскага.

Улады Нарваўскай гміны і дырэкцыя гімназіі летась прынялі рашэнне аб прысваенні гімназіі імя свайго земляка. У лістападзе мінулага года адкрылі былі мемарыяльную табліцу ў гонар архіепіскапа на будынку школы, устаноўленую Сяргеем Мартынюком, уласнікам нарваўскай фірмы „Пронар". Сустрэча ў школе была таксама нагодай для падзякі школьнага асяроддзя ўсім заслужаным ва ўвекавечанні памяці архіепіскапа Мірана. На ўрачыстасці, апрача гімназістаў, прысутнічала, між іншым, сям'я ўладыкі Мірана — сястра Барбара Паўлючук і пляменніцы Наталля і Марта, двоюрадныя сёстры Крыстына Паўлючук, Іаланта Асташэўская, прадстаўнік мітрапаліта Васіль Рошчанка, сябра патрона дэкан сухапутных войск палкоўнік Міхал Дудзіч:

— Уладыка Міран быў сынам Нарваўскай і Гайнаўскай зямлі. Заўсёды казаў, што ён беларус, беларус з-пад сахі і касы. Любіў людзей, царкву, службы, войска. Заўсёды сюды вяртаўся думкамі.

У час урачыстасці, якой найважнейшым момантам было прысяганне першакласнікаў гімназіі на сцяг школы, гімназісты ўшанавалі памяць архіепіскапа Мірана. Дырэктар школы Юры Астапчук падзякаваў усім людзям, якія дапамаглі ў ініцыятыве прысваення гімназіі імя ўладыкі і адкрыцці мемарыяльнай дошкі. Былі сярод іх, між іншым, Сяргей і Ніна Мартынюкі, Ян і Надзея Чэрнякевічы, Аліна і Раман Анікіюкі, Ян Мінюк (фундатар сцяга школы), Ян Сухадола (фундатар сцяга гімназіі), Андрэй Асташэўскі, Дарота Вайцяхоўская, Барбара і Міраслаў Ляўчукі, Анна і Радаслаў Пякарскія, Аліна Кананюк.

— Дырэкцыя, настаўнікі, вучні і бацькоўская рада школьна-дашкольнага комплексу ў Нарве маюць гонар падзякаваць за агромны ўклад у арганізацыю прысваення імя архіепіскапа, дывізійнага генерала Мірана Хадакоўскага Гімназіі ў Нарве, — сказаў, уручаючы дыпломы і гравертоны дабрадзеям, віцэ-дырэктар школы Ігар Лукашук. — Задачай кожнага чалавека з'яўляецца дбайнасць аб уласную спадчыну і тоеснасць. Сваёй ангажаванасцю і падтрымкай вы далі выраз сведчанню прывязанасці да гэтых універсальных і неацэнных каштоўнасцей. Вы, група цудоўных людзей, падтрымалі нас у тым, каб мы мелі такога выключнага патрона. Выключнага не з-за займаных пасад, але праз прызму сваёй чалавечнасці, сваёй працы дзеля іншых людзей, дзеля Праваслаўнай царквы. Сёння вучні першых класаў прысягаюць на сцяг, на якім віднеюць словы „Вера, трываласць, дапамога іншым". Каштоўнасці такія важныя, ды яны часта забываюцца ў сучасным свеце.

Словы падзякі выказалі таксама Агнешка Ярмоцік — страшыня бацькоўскай рады школы, старшыня Гміннай рады Эва Урбановіч, войт Нарваўскай гміны Андрэй Пляскавіч. Удзел ва ўрачыстасці царкоўных і самаўрадавых улад, якія ўдастоілі гадавіну і прысягу вучняў, сведчыць пра важнасць гэтай урачыстасці і ўвекавечання памяці незвычайнага земляка і святара не толькі для школьнай грамады, але і пазашкольнага асяроддзя.

У гімназіі ў Нарве таксама адзначаецца дзень нараджэння архіепіскапа Мірана (21.X.1957). 21 кастрычніка арганізуюцца конкурсы ведаў аб патроне. Сёлета таксама адбыўся мастацкі конкурс на партрэт архіепіскапа. Выява патрона пераможцы I месца Магдалены Франкоўскай была аздобай стэнда з лозунгам ягоных жыццёвых прыярытэтаў.

— Ёсць людзі, якія адыходзяць, але якія нас не пакідаюць, — гэта словы з паэтычнага мантажу, які падрыхтавалі вучаніцы. — Такія, якія могуць быць далёка, і якіх не можам убачыць, але якія глыбока прысутныя ў нашых успамінах. Найшаноўны ўладыка Міроне, чаму згасла свяча Твайго жыцця? Нам здаецца, што яна надалей палае, і ўсе чакаем Твайго прыбыцця... Загінуў Ты не на „нялюдскай зямлі", а на людскай, бо там злачыннай была сістэма. Спачыў у манастыры ў Супраслі, манастыры, які так улюбіў, у якім рэактываваў манаскае жыццё... Мала хто ведае, колькі труду, сілы і здароўя ўклаў Ты ў яго аднаўленне... Разбіўся прэзідэнцкі самалёт, наш архіепіскап ляцеў, каб упамянуць імёны загінуўшых у Катыні... А Тваёй матулі трэснула сэрца: не хацела, не магла жыць, як кахаючая маці адышла ціха, туды, дзе Ты... Ягоныя ідэі — веры, непахіснасці на шляху да мэты і дапамога іншым гэта не лозунгі напісаныя на нашым сцягу, а рэаліі нашай штодзённасці...

Троіцкая царква

Тэкст і фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

Вячэрні аспект

Уздзвіжанскі касцёл

Прадцечанская царква

Апынуўся я ў адзін нядаўні вечар, у аўторак, у Гайнаўцы. І залезла мне ў галаву думка пабачыць вячэрняе жыццё нашага пушчанскага горада. Беластоцкія ж нашы інтэлектуалы часам публічна наракаюць, што ў Беластоку адсутнічае вячэрне-начное жыццё, характэрнае буйным культурным цэнтрам; з гэтага і маё нечаканае зацікаўленне гэтым аспектам у гайнаўскім маштабе.

Дзе ў Гайнаўцы можа праяўляцца тое вячэрняе жыццё, не хатняе, але ў межах культурных ці іншых забаўляльных устаноў? Павінна там, дзе і ўсюды — значыць, у цэнтры. Ну і прайшоўся я па гайнаўскім City, значыць, па цэнтры горада, які, як мне зараз здаецца, складаюць вуліцы 3 Мая (паводле старога стылю, значыць пры ранейшым грамадскім парадку — 1 Мая) і Баторыя (Варынскага, калі не памыляюся, паводле ст.ст.).

Заглянуў я ў спажывецкі Market, што пры стыкоўцы гэтых вуліц, значыць, у самім самюсенькім цэнтры нашага маладога горада, дзе ў мой малады час была заправачная станцыя. І спытаў маладаватую працаўніцу гэтай гандлёвай установы, ці тамашнія сакральныя аб'екты падсветлены ўсю ноч. Жанчынка не ведала, але выказала меркаванне, што яны падсветлены ў той сам час, у які працуе вулічнае асвятленне. Да каторай гадзіны тое асвятленне працуе, яна не ведала. Бо і што ж робіць маладая жанчына пасля вячэрняй працы за прылаўкам? Адпачывае, а не даследуе, дзе і ў які час гарыць вонкавае асвятленне. Магла б, праўда, гэта ад некага пачуць, але, відаць, не гэтым гарыць ейнае сэрца, мабыць, самыя гарачыя яго маладыя парывы з іх найярчэйшымі начнымі ўспышкамі асталіся за бугарком гадоў.

Па вуліцы Баторыя ў сем гадзін вечара працавалі толькі буйныя г.зв. маркеты. Не заўважыў я там ніводнай кавярні, нават ніводнай піўнушкі. Зірнуў я і ўглыб вуліцы кс. Верабея (Бучка паводле ст.ст), але і там цішыня. Зрабіўшы круг, павярнуў я ў вуліцу Пілсудскага (Вызвалення паводле ст.ст.), пакінуўшы за сабою ярка асветлены партал традыцыйнага банка і чарговы маркет. У глядзельнай зале аквапарку адбываліся нейкія заняткі. Вакол басейна дзве гімнастычныя залы: старая, у якой некалі праводзіў шмат вечароў і я, і новая — белліцэйская; гарэла ў іх святло, але не відаць было жывой душы. Залі ты святлом франтон страхавой фірмы і кааператыўнага банка. У былым кінатэатры „Leśnik" зараз таксама гандлёвы цэнтр, а кіно, здаецца, пайшло па прароцтве Адама Міцкевіча і „trafiło pod strzechy"; няма ўжо яго нават у Музеі. Рэстаран „Leśniczanka", што на рагу 1 Мая і Арміі Краёвай (Леніна паводле ст.ст.), спаглядаў на мяне цёмным маўчаннем; жыве ён, здаецца, толькі ў вясельныя дні — з пятніцы па нядзелю. Затое недалёка ярка свяціўся партал новага аквапарку, перад якім стаяла звыш дзесятка легкавушак; перад маркетамі было іх крыху менш.

Былі падсветлены каталіцкія касцёлы і праваслаўныя цэрквы, але баптысцкі касцёл ужо не, бо і яго архітэктурнае афармленне даволі сціплае. Не толькі па Баторыя, але і па ўсіх іншых вуліцах не ўдалося мне заўважыць ніводнай установы, дзе б можна было правесці пазахатні вечар. Воляй-няволяй жыхары Гайнаўкі мусяць сядзець у сваіх блоках ці асабняках. У вокнах тых згаданых блокаў дзе-нідзе гарэла яркае лямпачнае святло, у некаторых мігцела тэлевізарная люмінісцэнцыя. Тэлебачанне сталася spiritus movens грамадскага жыцця гарадскіх выхадцаў з нашых вёсак. Бо ж калі б нашы гараджане хацелі праводзіць свой вольны час навонкі сваіх кватэр, калі б было такое запатрабаванне... Але яго, мабыць, няма. Дастаткова тэлебачання.

Прыгадваецца мне адзін з галоўных лозунгаў, якімі ў мой малады час кармілі насельніцтва тагачасныя сродкі масавай інфармацыі — у камунізме кожнаму мела быць паводле ягоных патрэбнасцей. І, здаецца, калі гаварыць пра духоўныя патрэбнасці, то насуперак цяперашняй законнай забароне нам камуністычных памкненняў, наша грамадства акурат імі, духоўнымі патрэбнасцямі, поўнасцю забяспечана з падключанага да сцяны экрана, здзяйсняючы мары колішніх прапагандыстаў. Дастаткова ўхапіць у руку тэлепульт і чалавек ужо ў раю. Не ў раю, абяцаным рэлігіяй, бо той будзе пазней і мала каму, але ў зямным раю, дзе можна ўключыць сабе любую духоўную службу: „Klan", „Pod znakiem wiary", „M jak miłość", „Włatcy móch", „Niania", „Taniec z gwiazdami", „Świat według Kiepskich", „Wiadomości", „Obiektyw", „Wydarzenia", „Fakty" і г.д., і т.п.

Калі я ўжо зачапіў колішні камуняцкі час і апошнія інфармацыйныя перадачы, то варта прыгадаць і галоўнага вешчуна, што паінфармаваў пра ўступленне перадавога на той час грамадства на прыступкі зямнога раю — Леаніда Ільіча Брэжнева, славутага носьбіта геройскіх зорак і розных іншых медалёў. Старэйшае пакаленне пэўна помніць, як ён акуратна чытаў з напісаных яму картачак. Сённяшні наш чалавек не мусіць ужо мазоліцца чытаннем — яму ўсё прачытаюць з тэлевізара. Прачытаюць, што толькі захоча — хопіць належна шчоўкнуць пультам лежачы ў пасцелі. Такі рай маем. Мо толькі замала маем асабістых медалёў, але ж, па шчырасці, якія з нас героі?

Так сабе ходзячы па гайнаўскім City ад сёмай да восьмай вечара сустрэў я крыху за дзесятак спяшаючых дахаты адзінокіх прахожых. І менш чым пальцаў адной рукі вельмі нясмелых парачак. Наракаюць часта нашы дэмографы, што падае натуральны прырост. Ну, але ж адкуль яго ўзяць, калі больш жару ў адмысловых тэлеканалах, чым у райска-зямной наяўнасці. Дарэчы, натуральнага прыросту ў раю не было, ён пачаўся толькі пасля выгнання адтуль Адама і Евы.

Аквапарк

1 ☞ працяг

Уладзімір Някляеў — кандыдат у прэзідэнты. Прысуджаны да двух гадоў з адтэрміноўкай на два гады. Сусветна вядомы паэт, з пошукаў паэтычнай праўды, сарганізаваў вельмі патрэбную грамадству кампанію „Гавары праўду". Жорстка збіты, з траўмай галавы, 19 снежня са шпіталя забраны КДБ у турму. Знаходзячыся пад хатнім арыштам у сваёй кватэры, пераслаў эсэмэскай верш-песню „Красуня-вясна", якую спявае Зміцер Вайцюшкевіч. Зараз забаронена яму не толькі выязджаць за мяжу ў палітычна-культурных справах, але і для ратавання свайго здароўя.

Зміцер Дашкевіч — нязломны лідар Маладога фронту, арыштаваны дзень перад выбарамі, беспадстаўна абвінавачаны і прысуджаны да двух гадоў турмы. Некалькі разоў аб'яўляў галадоўку супраць фізічным і маральным здзекам, за што трапляў у карцар. У турме прыйшлося яму святкаваць сваё трыццацігоддзе і ўзяць шлюб з Настай Палажанкай, якую таксама арыштоўвалі і саджалі за краты на некалькі сутак толькі за павагу да бел-чырвона-белага сцяга.

Павал Севярынец — лідар Беларускай хрысціянскай дэмакратыі, раней Маладога фронту. Нашчадак праваслаўнага святара, пахаванага ў Варшаве каля царквы на Волі. Зараз за ўдзел у снежаньскіх падзеях прыгаворны да трох гадоў „хіміі" — працы ў выпраўляльнай калоніі, што побач Пружан. Гэта не першае пакаранне „хіміяй" выдатнага знатака беларускай ідэі і культуры, пісьменніка, журналіста.

Зміцер Бандарэнка быў адным з кіраўнікоў выбарчага штаба Андрэя Саннікава, за што атрымаў два гады пакарання. У турме мае вялікія клопаты са здароўем. Перанёс цяжкую аперацыю на пазваночніку, пасля якой ізноў накіраваны ў турму, а не на рэабілітацыю. Быў вылучаны ў гэтым годзе на міжнародную прэмію імя Сахарава.

На жаль, гэта не поўны спісак палітычных ахвяраў, пералічаны мною, тых што зараз знаходзяцца ў беларускіх турмах. Трэба памятаць і пра ўсіх другіх, хто без працы і волі паддаецца штодзённа ціску ў кожным кутку Беларусі. А такіх дзесяткі тысяч. І таму з поўнай адказнасцю можна сцвярджаць, што сённяшні рэжым з'яўляецца антынародным і антыбеларускім.Ён дзеля ўлады распрадае і самыя гаспадарчыя цэннасці краіны. Продаж цалкам Белтрансгазу расейскаму Газпраму — чарговы крок да патраты суверэннасці. Тых, хто мог бы арганізаваць пратэсты, пасадзілі ў турмы, або прымусілі да эміграцыі. Але не будзе гэта вечна!

Фота і тэкст Ганны КАНДРАЦЮК

Белы конь і нелегальныя папяроскі (5)

Яшчэ ў той самы дзень, пасля таго, калі мы з Д. прыбралі прыступкі да пячоры святога Іова, мы з'ехалі ў Ковель. На маршрутцы — люкс. Каб збіць нудоту вечара, шафёр уключыў тэлесерыял пра шляхетных людзей поспеху. Усе яны заўзята званілі сваёй маці, каб пахваліцца апошняй удачай і дробнымі пакупкамі: *Купил для тебя новы дом, мамаша.*

У гэтай маршрутцы не хапала рэлігійна-патрыятычнай галерэі. Дарэчы, цэлы салон явіўся як месца прэстыжу і адпачынку. У самым канцы знаходзіўся міні-бар са столікам і фатэлямі, састаўленымі ў паўкруг. Пасярэдзіне салона вісеў аўтамат для кавы і гарбаты. Побач віднеў туалет. Аднак найбольш увагі і страсцяў выклікаў тэлевізар-плазма, які павесілі над галовамі пасажыраў ля першых фатэляў. Ён што раз наклікаў ядавітыя каментары і злосць. Усё з-за абмежаванай прасторы. Калі хто новы заходзіў у салон, абавязкова, як баран, біў галавой у тэлівізар.

— *Стоп!* — раўеў шафёр. — *Куда же лезеш, бл...!*

Ніхто не рэагаваў і не заступаўся за ахвярай выпадку. Эмоцыі кружылі вакол прыкладных герояў тэлесерыяла. У момант, калі на экране паказвалі *як п'юць чай у Парыжы*, мне самой схацелася папіць гарбаткі з аўтамата. На месцы чакала няўдача. Прылада не прымала манет, ды выглядала так, быццам ніколі і не працавала. Туалет таксама стаяў апячатаны і закрыты на тры замкі. У гарадах маршрутка спынялася на паўгадзіны, і тады панавала дзіўная таўканіна: адны ішлі пакурыць, другія вярталіся ад курэння. І так наперамен, туды-сюды. Трыццаць хвілін, бесперапынна...

* * *

Сярод тых пасажыраў я выгледжвала жанчын падобных на Надзю Дэнісюк. Украінскія жанчыны ахвярныя рызыканткі. Яны гатовы ехаць на край кантынента, каб падзарабіць грош і падмацаваць бюджэт сямейкі. Гэтых жанчын пабачым пасля ў цягніку на Варшаву, калі цярпліва будуць пераносіць фанабэрыі *пана кандуктара*. Біяграфія Надзі Дэнісюк пазначана чужымі гарадамі і месцамі. Цягам апошніх гадоў падзарабляла служанкай і апякункай у Польшчы. Досвед пакінуў супярэчныя ўяўленні пра краіну і характар палякаў. Першая пані была горшай за чорта, марыла голадам і прыніжала. За тыя польскія грошы, дзвесце долараў у месяц, паставіла ў хаце тэлефон і душ. Пасля паехала працаваць апякункай у інтэлігенцкай сям'і. Сваіх гаспадароў палюбіла як родных бацькоў. І галоўнае: добра падзарабіла. За польскія грошы рашыла пабудаваць плот на каменным падмурку. Цяпер усе суседзі зайздросцяць...

Калі першы раз з Д. трапілі мы ў дом Надзі Дэнісюк, яшчэ да Аранжавай рэвалюцыі, запамятаўся адзін здымак. На ім віднеў заснежаны горад, з вуліцамі і забудовамі пад лінейку. Халодная аўра здымка дзіўна кантраставала з іконай Пачаеўскай Божай Маці ў агні і персідскімі дыванамі на сцяне. Той здымак з Рэспублікі Комі для нашай гаспадыні не асацыяваўся з марозам і прыніжэннем. Наадварот, ён напамінаў пра лепшыя гады жыцця, праведзеныя за палярным кругам.

* * *

— Жыццё кінула нас як сляпых кацянят у акіян, — кажа пра свае маладыя гады Надзя. У дзевятнаццаць гадоў, з дзевяцімесячным сынком на руках, села ў цягнік і адправілася ў Інту, што за няслаўнай Варкутой. Два тыдні раней з'ехаў туды муж Вася, ды адразу стаў працаваць на шахтах. Першыя гады жылі ў былых лагерных бараках. Надзя закончыла сярэднюю школу і стала працаваць у гандлі. Найгорш было, калі ў Васі ламаліся ногі, заўсёды ў тым самым месцы, у пятцы. Пасля дваццаці гадоў жыцця ў Сібіры вярнуліся ў Пачаеў і пабудавалі свой дом. А сын паехаў вучыцца ў Маскву і там застаўся жыць. Заснаваў сям'ю.

— Сібір для вас была піянерскай прыгодай, выклікам? — пытаю.

— А дзе там! — чую ў адказ. — На месцы не было як жыць. Цешча мяне не любіла, усё празывала галышкай. Я з беднай сям'і. Але свой гонар маю. То каб не чыпець у цёшчы на шыі, паехалі на край свету пазмагацца за сваю долю і незалежнасць...

Калі думаю пра Надзю, заўсёды бачу яе ў дзеянні, як прыбірае, гатуе, чысціць пасудзіну. Хатняя праца супакойвае яе. Папраўдзе, хвалюе яе палітыка. Баліць крывадушнасць, абыякавасць. Той, хто не палез у сабачую шкуру, замкнуўся ў сям'і. Каго не спытаць, усе збіраюцца ў эміграцыю, найлепш, каб як найдалей ад роднай Украіны.

— Ад таго ўсяго мне холадна на радзіме, — кажа Надзя.

— Пасля дваццаці гадоў жыцця за палярным кругам?

— Там добра ведалі хто бандыт, а хто чалавек...

(працяг будзе)

З Надзяй Дэнісюк у яе доме

Развітальны крыж у канцы гарадской вуліцы

Свята ў Тапарках

Фота БАГУСЛАВЫ ЧАРКОЎСКАЙ

13 лістапада ў Тапарках Кляшчэлеўскай гміны праходзіла незвычайнае мерапрыемства — была здадзена ў карыстанне пасля рамонту святліца. Кошт інвестыцыі склаў суму 136 871,45 зл. У рамках мадэрнізацыі былі зменены дах і шалёўка, а ўнутры — дзвярная і аконная сталярка. Драўляную падлогу заступіў грэс. Прытым святліца атрымала ацяпленне. Будынак змяніў сваё аблічча...

Тапаркі лічаць больш васьмідзесяці гаспадарак. Многія дамы пустуюць. Але ў апошніх жывуць людзі, якія складаюць адну дружную сям'ю. І для іх гэта Музей і асяродак беларускай культуры ў Гайнаўцы ў супрацоўніцтве з Гарадскім асяродкам культуры і Гарадской радай у Кляшчэлях арганізавалі беларускі фэст пад назвай „І тут жывуць людзі". У імпрэзе ўдзельнічалі дырэктар Музея Тамаш Ціханюк, бурмістр Кляшчэляў Ірэна Негярэвіч, дырэктар ГАК Лявон Алексяюк і шматлікая публіка з Тапаркоў ды навакольных вёсак. Дырэктар Музея Т. Ціханюк, узяўшы слова, падзякаваў мясцовай грамадскасці за стварэнне спрыяльных умоў для развіцця культуры беларускай нацыянальнай меншасці, а бурмістру Ірэне Негяревіч і дырэктару ГАК Лявону Аляксеюку ўручыў апошняе выданне Музея — памятныя альбомы „Падляшша ў аб'ектыве". Затым пачалася мастацкая частка. Першым выступіў гурт „Ручаёк" з Белавежы пад мастацкім кіраўніцтвам Марка Зубрыцкага — акампаніятара і заадно арганізатара калектыву. Пасля выступілі „Калінка" з Беластока пад кіраўніцтвам Мар'юша Харужага, мужчынскі інструментальны рок-гурт „Нарва" і „Арт-Пронар" з Нарвы. „Калінка" прэзентавала песні са свайго апошняга кампакт-дыска, а хлопцы з „Нарвы" весялілі публіку аранжацыяй вядомых народных песень. Канцэрт завяршыў вакальны ансамбль „Арт-Пронар". Пачаў ён выступленне песняй „Белая Русь", якая сёлета на аглядзе беларускай песні заваявала першае месца. Шматлікая публіка абдарыла артыстаў бурнымі апладысментамі. На фэсце працавалі прылаўкі з выданнямі сучаснай і антыкварнай беларускай літаратуры ды народным рукадзеллем. Варта адзначыць, што бурмістр Кляшчэляў падрыхтавала адмысловы конкурс на тэму ведаў аб гміне. Увагі заслугоўвае факт, што ўдзельнікі конкурсу станоўча адказвалі на пытанні, за што ва ўзнагароду атрымалі падарункі. Мерапрыемства пасляхова вялі дзве сімпатычныя канферансье Марыёля Герман і Паўліна Паўлючук. Быў гэта апошні ў гэтым годзе беларускі фэст з цыкла „І тут жывуць людзі". Такія імпрэзы арганізаваліся на Гайнаўшчыне ў шасці гмінах: Янова (гм. Нарва), Свінароі (гм. Нараўка), Войнаўка (гм. Дубічы-Царкоўныя), Кленікі (гм. Чыжы), Бабровка (гм. Чаромха) і Тапаркі (гм. Кляшчэлі). Кожны з гэтых фэстаў карыстаўся сардэчным прыёмам, бо гучала на іх беларуская народная музыка і песня, ажывала культура і мацавалася нацыянальная тоеснасць.

Уладзімір СІДАРУК

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі

Пад сцягам архіепіскапа Мірана

Ад года гімназія ў Нарве носіць імя земляка, дывізійнага генерала, архіепіскапа Мірана Хадакоўскага, які загінуў у авіякатастрофе разам з 95 іншымі асобамі 10 красавіка 2010 года пад Смаленскам. 21 лістапада, у дзень прысягі першакласнікаў, адбылася ў школе адмысловая ўрачыстасць успаміну пра патрона, з завяршэннем конкурсаў і ўручэннем падзячных памятак асобам, заслужаным для школы, і ўвекавечання імя архіепіскапа.

Уля Беразавец:

— У нашай школе ёсць куток памяці пра нашага патрона архіепіскапа Мірана, ёсць таксама табліца на будынку школы, якую павесілі летась у час прысваення імя нашай гімназіі. У школе арганізуецца дзень патрона, і тады адбываюцца розныя конкурсы, звязаныя з яго асобай. Гэты адзначаем 21 кастрычніка, у яго дзень народзінаў. Сёлета быў у нас мастацкі конкурс — на партрэт архіепіскапа Мірана, а таксама конкурс ведаў пра яго асобу. Многа вучняў прымае ўдзел у такім конкурсе — мы шмат ведаем пра патрона, таму што ў нашай школе многа гаворыцца аб ім. Амаль кожны гімназіст хацеў прыняць удзел у конкурсе, тым больш што былі цікавыя ўзнагароды. Што мяне асабіста прыцягвае да асобы архіепіскапа Мірана? Ягоныя прынцыпы, якімі ён кіраваўся ў жыцці — вера, трываласць і дапамога іншым. Я бачыла як ён служыў багаслужбы ў царкве, прымала ўдзел у дэкламатарскіх конкурсах рэлігійнай паэзіі ў яго прысутнасці. Гэта быў скромны, уражлівы і добры чалавек.

У конкурсе „Патрон у маіх вачах" — мастацкім — I месца за партрэт Мірана атрымала Магдаліна Франкоўская, II — Наталля Кобац і Наталля Келбашэўская, III — Кацярына Міранюк (усе яны з II „б" класа). У конкурсе „Што ведаем пра патрона нашай школы" на I месцы апынуліся Паўліна Ваўранюк (II „а" кл.) і Наталля Келбашчэўская (II „б" кл.), на II — Наталля Русіновіч (II „б" кл.). Паўліна Ваўранюк:

— Мы пісалі тэст па ведах пра нашага патрона, і мне ён найлепш удаўся. Я бачыла архіепіскапа Мірана не раз, прымала ўдзел у літургіях, якія ён служыў. Ён быў чалавекам, для якога найважнейшымі былі іншыя. У нашым месцы памяці занодзяцца яго фотаздымкі, ягоная вайсковая форма, калі ён быў у Афганістане, таксама літургічнае аблачэнне. Мы падрыхтавалі на дзень патрона літаратурны мантаж, дзе ўспамінаем ягоны жыццяпіс і чытаем творы пра яго на польскай і беларускай мовах.

Біяграфічна-паэтычнае выступленне гімназістак пра патрона школы выклікала ў сабраных на ўрачыстасці хваляванне, асабліва сярод тых, хто ведаў патрона як святара, сямейніка і сябра.

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

Сцяганосцы гімназіі. Першая справа — Паўліна Ваўранюк

Першакласнікі гімназіі ў Нарве

Паўліна Ваўранюк здабыла I месца

Вершы Віктара Шведа

Сямейныя тайны

— Я ведаю ўсе тайны
— сказаў маці.
Яна сыночку дваццаць
злотых плаціць.
— Я ведаю ўсе тайны.
— Мілы тата
Даў сыну сотню злотых
— ён багаты.
— Я ведаю ўсе тайны
— сказаў суседу,
Зрабіў ён выгляд,
быццам іх не ведаў.
— Хадзі, сынок, няхай
за тайну тую
Цябе цяпер сардэчна расцалую.

На моры

Жанчына пытае пасажыра:
— Скажыце, калі ласка, шчыра,
Якая глыбіня тут мора?
— Дваццаць метраў, гавораць.

— А мне сказалі акурат,
Што метраў больш
за пяцьдзесят.
Адразу страціла надзею,
Бо плаваць я зусім не ўмею.

Галерэя ЗОРКІ

Фота Ганны Кандрацюк

1. **Імя і прозвішча:** Нюта Карнілюк (ПШ н-р 4 у Беластоку).
2. **Твой любімы прадмет:** матэматыка, беларуская мова, усе пазаўрочныя гурткі на беларускай мове: тэатральны,мастацкі, музычны.
3. **У жыцці хачу стаць:** дзядуля кажа, што буду банкірам.
4. **У сяброў цаню:** весялосць, і калі яны моцна не крыўдуюць.
5. **Не люблю:** калі сябры крыўдзяцца з-за абы-якой прычыны і калі не ўмеюць быць сімпатычнымі.
6. **Па-беларуску размаўляю:** з братам, з мамай і татам, з бабуляй і дзядулямі, з настаўніцай беларускай мовы.
7. **Кніжка, якая мяне захапіла:** «Baśniobór» Брэндана Мула.
8. **Падабаецца мне музыка:** моцны рок.
9. **Твае ўлюбёныя стравы:** піца і бульба-фры.
10. **Твой любімы спосаб адпачынку:** люблю ездзіць на ровары.
11. **Калі дарасту хачу жыць:** у Супраслі, там дзе жыву.

Што ведаем пра прыніжанасць, няволю і родны кут?

Нінка Ваўранюк з партрэтам дзеда Валодзі

— Сёння ў мяне патройнае хваляванне, — прызнаецца Ніна Ваўранюк, — бо майго дзедкі няма ўжо ў жывых, бо выступаем у Тыневічах-Вялікіх і прыйдуць сваякі, бо гавару яшчэ ролю Касі Бялькевіч, якая захварэла і трэба яе заступіць...

Расказ Ніны Ваўранюк найбольш літаратурны сярод гісторый „Падляшскіх хронік". Там прамаўляюць вобраз, настрой. Успамін вайны наклікае агонь, калі ўвосень гаспадары паляць бульбянішчы ў полі. Сам герой з'яўляецца мімавольным удзельнікам гісторыі.

Рэч ідзе пра чалавечае рабства, калі ў час апошняй вайны немцы вывозілі маладых хлапцоў і дзяўчат на прымусовыя работы ў Нямеччыну. Сярод іх апынуўся Валодзя Ваўранюк, дваццацігадовы юнак з Тыневіч. Працаваў ён у баўэра, нямецкага фермера пад Ольштынам. І, як сказана ў спектаклі, работы ён не баяўся. Даглядаў дабытак, даіў кароў, працаваў у полі. Калі выпадаў вольны час, праводзіў яго ў кампаніі моладзі, вывезенай, як і ён сам, у Германію і застаўленых працаваць нявольнікамі. У цэлым гэтым кашмары найгоршай была настальгія. Сум па родным доме і кутку прывялі да хваробы, у выніку якой страціў свае буйныя валасы, якія прыгожа ўкладаліся ў хвалі. Найгорш было ўвесну, калі ажывала прырода. Валодзя думаў тады пра сяброў, пра агулькі, якія спяваюць у іх на вуліцы...

— Калі я рыхтавала гэты расказ, дзедкі не было ўжо ў жывых, — адзначае Нінка. — Пра гэта ўсё расказаў мне бацька. Раней я не думала, што ў дзеда былі такія страшныя досведы, бо ён быў вельмі задаволеным жыццём чалавекам, любіў пажартаваць. З яго асобай у мяне найцяплейшыя ўспаміны: гэта супольныя Каляды і Вялікдзень.

20 лістапада спектакль „Ой, даўно-даўно", ужо дзевятнаццаты і дваццаты раз, беластоцкія ліцэісты і гімназісты паспяхова запрэзентавалі ў Тыневічах-Вялікіх і Трасцянцы. Іх хвалілі і запрашалі зноў наведаць вясковыя парогі. І віншавалі з ідэяй. Сюжэт напісаны жыццём, хай сабе і няпростым, жахлівым, цікавейшы за ўсякія выдумкі і феерверкі.

А я ўсё думаю пра „патройнае" хваляванне Нінкі і ўсе добрыя эмоцыі, якія беластоцкія дзяўчаты і хлопцы прывезлі сваім дзядулям і сваякам!

Фота і тэкст Ганны КАНДРАЦЮК

Музыка з кайфам

Будзь сабой!

Напэўна не адзін раз ужо ў „Музыцы з кайфам" заклікала я вас быць сабой. Праўду кажучы гэта адзіная парада, якая не з'яўляецца нейкім маралітэтам дарослых, накіраваных у бок дзяцей і моладзі. Вы, пэўна, згодны... Хаця вядома, як складана захаваць незалежнасць у сённяшнім свеце. Дарэчы, у любой рэчаіснасці гэта цяжка, бо ці жывеш паводле прынцыпаў вялікай сям'і, ці ў рамках закрытага грамадства, ці нават у гіперадкрытай групе людзей, заўсёды ёсць нейкія рамы, нейкія прынцыпы, нават традыцыі і звычаі, якія вызначаюць рытм жыцця і спосаб паводзін. Галоўнае, не ламаць гэтых прынцыпаў, а ўсё ж такі захаваць незалежнасць думання. Гаварыць можна доўга, пісаць таксама, але несумненна лягчэй слухаць музыкі. Я таксама заахвочваю слухаць, тым больш, што сярод беларускіх музыкаў ёсць шмат ідэйных асоб, якім слухач неабыякавы, а музыка, хаця перш за ўсё мае несці задавальненне, радасць і прыемнасць, расказвае пра рэчы важныя.

Музыкі бярозаўскага гурту :Б:Н: ведаюць як жывецца ў малым гарадку і колькі працы трэба прысвяціць, каб выйсці на шырэйшую публіку. Калі ёсць ахвота працаваць, але і гуляць адначасова, бо толькі дзіцячая радасць гарантуе свежасць, заўсёды будзе шанц знайсці папулярнасць. Маючы такі вопыт не здзіўляе, што „бээнаўцы" спяваюць „Будзь сабой!".

Рэфлексіўныя таксама маладыя берасцейцы. Шмат ужо гадоў на сваю публіку працуюць музыкі гурту „Сцяна" і напэўна разумеюць, колькі трэба зрабіць, каб на сваёй „сцяне" мець прыхільнікаў і магчымасць свабоднай дзейнасці. Таму не здзіўляе, што спяваюць „Make yourself". Новая песня „Сцяны" не толькі гаворыць, што трэба быць сабою, а яшчэ, што гэта мы рашаем пра свой лёс. А калі гучыць гэта неяк далёка і недаступна, то варта хаця б паверыць, што можам ствараць сваё наваколле і можам змяняць сваю рэчаіснасць. „Можна быць" — так спявалі хлопцы са „Сцяны" ўжо пару гадоў таму назад, але кожны з нас напэўна не толькі „можа быць", а перш за ўсё ёсць (!) і трэба, каб быў сабою!

i_basovka@o2.pl

Калядны конкурс

Прывітанне, сябры! У нас працяг тэматычнага конкурсу, звязанага з перыядам зімы. Разам з адказамі, калі ласка, пазначце нумар конкурсу.

1. Ад калі, паводле народных павер'яў, пачыналі спяваць калядкі:

а) ад 4 снежня, ад свята Увядзення ў храм Прасвятой Багародзіцы,

б) ад 25 снежня,

в) ад пачатку Піліпавага посту.

2. Назвіце прозвішча захавальніка старабеларускіх кантычак, спісаных на тэрыторыі Нарваўскай зямлі:

а) Цімафей Садоўскі з Тыневіч-Вялікіх,

б) Віктар Швед з Мора,

в) Дарафей Фіёнік са Студзіводаў.

3. Хто з'яўляецца патронам Публічнай гімназіі ў Нарве:

а) генерал Зыгмунт Берлінг,

б) партызаны Храноўскія,

в) генерал епіскап Міран (Хадакоўскі).

4. Як нашыя продкі называлі драўляныя санкі для перавозу драўніны з пушчы:

а) шыткі,

б) сукі,

в) балёны.

Адказы дасылайце да 11 снежня 2011 г. (найлепш па электронай пошце на адрас „Зоркі"). Тут разыграем цікавыя ўзнагароды: беларускія кніжкі, CD і гульні.

Рашэнне конкурсу № 7:

Скіт архімандрыта Гаўрыіла знаходзіцца ва ўрочышчы Кудак непадалёк Нарвы; у гербе Беластока — конь; турыстычны шлях пра духоўную і матэрыяльную спадчыну Падляшша — „Дрэва і сакрум"; на зіму застаюцца ў нас вераб'і. Узнагароды — фотаальбомы з Нарвай і ландшафтнымі паркамі — выйгралі Бася Нядзельская з Гайнаўкі і Давід Яцкевіч з Нараўкі. Віншуем!

ЗОРКА

Польска-беларуская крыжаванка № 49

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 45:

Там, граб, расол, муж, верабейка, арабінка, кантакт, напой, рост. Ванна, намер, бурак, жаба, бінт, момант, сойка, какос, елка.

Узнагароды, запісныя кніжкі, выйгралі **Моніка Асташэўская, Паўліна Паплаўская, Юлія Ваўранюк, Магдаліна Навіцкая, Эльвіра Андрусевіч, Дыяна Саўко** з Бельска-Падляшскага, **Марк Панькоўскі** з Нараўкі, **Аня Урбановіч** з Нарвы, **Дыяна Галёнка** з Дубіч-Царкоўных. Віншуем!



Тэкст і фота
Аляксея МАРОЗА

Мастацкія сустрэчы школьнікаў

Натуральным з'яўляецца тое, што вучні з большымі амбіцыямі, якія ходзяць на дадатковыя заняткі, напрыклад, на ўрокі беларускай мовы ці музыкі, маюць патрэбу паказаць свае ўмеласці перад шырэйшай публікай, а перш за ўсё перад бацькамі і сямейнікамі і дзеля гэтага арганізуюцца ім конкурсы і агляды. Ян Карчэўскі, настаўнік беларускай мовы ў Комплексе школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы і заадно намеснік старшыні Аб'яднання „Музей і асяродак беларускай культуры ў Гайнаўцы" добра трапіў з прапановай арганізавання Мастацкіх сустрэч школьнікаў, якую накіраваў гайнаўскім вучням, якія вучацца беларускай мове. Гэтае мерапрыемства таксама адкрытае для іншых гайнаўскіх вучняў, якія маюць ахвоту выступіць з беларускім рэпертуарам. Хаця арганізатарамі сустрэч з'яўляюцца дырэкцыя згаданай школы і беларускі музей, то за ўсім мерапрыемствам ад пачатку наглядае і ўдала вядзе яго Ян Карчэўскі. Сярод публікі мастацкіх сустрэч заўсёды было многа бацькоў. Таксама было і 20 лістапада г.г. У прыгожа адрамантаванай кіназале Беларускага музея сабраліся настаўнікі гайнаўскіх школ і гайнавяне, бо гэтае мерапрыемства мае ўжо і сваю пастаянную публіку. У праграме VIII Мастацкіх сустрэч школьнікаў былі перш за ўсё прадстаўленні, кароткія інсцэніроўкі і песні.

Займальна вясельныя абрады паказалі вучні Падставовай школы № 3

Дашкольнікі з Самаўрадавага садка № 1 захапілі публіку сваімі шчырымі і адважнымі выступамі, песнямі, танцамі і гульнямі

Першымі выступілі дашкольнікі з Самаўрадавага садка № 1 у Гайнаўцы. Дашкольнікі запрэзентаваліся ў прыгожых уборах. Шчыра і адважна праспявалі яны беларускія песні, умела затанцавалі і паказалі гульні сваіх бабуль. Публіка была ў захапленні, што такая вялікая колькасць гайнаўскіх дашкольнікаў выступае на беларускай літаратурнай мове і на гаворках. У Гайнаўцы няма прадшколля з беларускімі аддзяленнямі, але гайнаўскія настаўніцы Міраслава Ніканчук і Ала Супрун ужо шэсць гадоў вядуць дадатковыя рэгіянальныя заняткі. Іх дзеткі развучваюць беларускія песні, вершыкі і танцы, знаёмяцца з гульнямі з выкарыстаннем мовы бацькоў, выступаюць на беларускіх дэкламатарскіх і музычных конкурсах. У музеі пакрысе паказалі тое, чым займаюцца ў прадшколлі і за гэта атрымалі бурныя апладысменты.

Інсцэніроўку „Вячоркі" ўдала прадставілі вучні Падставовай школы № 6

— Беларускім песням дзеткі вучыліся спяваць яшчэ вясной, а гульням з выказваннямі на сваёй мове сталі вучыцца з восені, — заявіла Ала Супрун.

— Мы ўжо раней выпрацавалі сваю праграму выступаў, але мяняем яе і папаўняем. Нашыя дзеткі нават больш ахвотныя вучыцца нашым песням, гульням і традыцыям, чым рыхтавацца да выступаў па-польску. Нашыя дашкольнікі таксама цікавяцца рэгіянальнымі заняткамі, калі мы часта з дапамогай дзядуляў ці бабуль расказваем і паказваем як калісь жылося, — гаварыла Міраслава Ніканчук.

Вядучы мерапрыемства Ян Карчэўскі расказаў пра адметны характар мерапрыемства для школьнікаў.

— Ідэя Мастацкіх сустрэч школьнікаў апраўдалася, бо сярод гайнаўскіх вучняў ёсць многія ахвотныя выступіць перад гарадской публікай, дзе, між іншым, за сваімі дзеткамі сочаць бацькі. Супрацоўніцтва з гайнаўскімі школамі складваецца добра. Рыхтуючыся да нашага мерапрыемства ў час пазаўрочных заняткаў і выступаючы ў час яго вучні разгортваюць свае ўмеласці і працуюць у напрамку лепшага валодання беларускай літаратурнай мовай. Для дзетак і моладзі выступы перад шырокай публікай гэта таксама прэстыж. Маючы на ўвазе папярэднія мастацкія сустрэчы можна сказаць, што зараз будзе больш калектыўных прэзентацый, чым раней, — адзначыў настаўнік Ян Карчэўскі.

З багатым і доўгім рэпертуарам, рэканструкцыяй „Вяселля", выступілі вучні Падставовай школы № 3 пад кіраўніцтвам настаўніцы беларускай мовы Марыі Крук. Падчас гэтай прэзентацыі на тварах сабраных было відаць вялікае зацікаўленне вясельнымі сцэнкамі, абапёртымі на аўтэнтычныя вясельныя абрады.

— Мы з „Вяселлем" выступілі ўжо на інаўгурацыі акадэмічнага года ўніверсітэта III веку, а ў верасні, кастрычніку і яшчэ перад сённяшнім мерапрыемствам правялі многа рэпетыцый. Займаліся мы на пазаўрочных занятках і на ўроках беларускай мовы, каб усё дапрацаваць. Большасць рэквізітаў я сабрала сама, некаторыя прывезлі бацькі, якія таксама дапамагалі падрыхтаваць уборы для вучняў. Зацікаўленне дзетак выступам было вельмі вялікае. Я старалася прыняць на рэпетыцыі ўсіх ахвотных, — гаварыла настаўніца Марыя Крук.

Ян Карчэўскі, гайнаўскія настаўніцы беларускай мовы і рэгіянальных заняткаў у прадшколлі

Усе настаўнікі, апекуны выступаючых, былі выкліканы перад публіку і з рук дырэктара Музея і асяродка беларускай культуры Тамаша Ціханюка ў падзяцы за працу з вучнямі атрымалі прыгожыя альбомы „Падляшша ў аб'ектыве", дзе змешчаны самыя лепшыя здымкі з аднайменнага конкурсу, які з 2005 года ладзіцца ў Беларускім музеі. Такі ж альбом атрымаў бурмістр Гайнаўкі Ежы Сірак, прысутны на мерапрыемстве, якое ладзіцца пры фінансавай падтрымцы гарадскога бюджэту. З „Вячоркамі", рэканструкцыяй даўніх вясковых спатканняў, удала выступілі вучні шостага класа Падставовай школы № 6 пад наглядам настаўніцы Людмілы Грыгарук. Запрэзентавалі яны цікавыя размовы і нашыя даўнія песні.

— Мы ўжо ад некалькіх гадоў паказваем нашыя даўнія традыцыі. У мінулым годзе выступілі з прадстаўленнем „Кірмаш", а сёлета запрэзентавалі „Вячоркі". Рыхтуючы такія інсцэніроўкі, вучні знаёмяцца з жыццём у мінулым, — сказала настаўніца Людміда Грыгарук. — Добра, што ў час мастацкіх сустрэч нашая моладзь мае магчымасць выступіць перад вялікай публікай, а таксама спаткацца з іншымі вучнямі, паглядзець на іх выступы і павучыцца іншаму, чым на ўроках.

— Аб многіх нашых традыцыях мы даведаліся толькі рыхтуючыся да мерапрыемства ў музеі. Нам хацелася выступіць перад іншымі і паказаць традыцыі, якія ўжо занікаюць, — сказалі вучаніцы „шасцёркі".

З нашымі песнямі прыгожа запрэзентаваліся таксама вучаніцы трэцяга класа Гімназіі № 2 (вучацца ў тым самым будынку), якіх падрыхтавала настаўніца Беата Кендысь.

— Мы любім спяваць па-беларуску і хацелася нам выступіць перад шырэйшай публікай са сваімі песнямі, — заявілі Дар'я Шыманюк і Марлена Добаш з Гімназіі № 2 (Комплекс школ № 3).

З інсцэніроўкай „Рэпка" цікава выступілі вучні чацвёртага класа Комплексу школ № 2 пад наглядам Эвы Анішчук. Удала запрэзентаваліся таксама вучні з гэтай жа школы з песнямі (рыхтавалі Эва Анішчук і Аліна Якімюк).

— Нашыя вучні, якія ходзяць на заняткі беларускай мовы, былі вельмі ахвотнымі да рэпетыцый і выступаў на сцэне. Нашым дзеткам дапамагалі таксама бацькі, перш за ўсё здабываючы прыгожыя традыцыйныя ўборы. Сёння родзічы прыйшлі паглядзець выступленні сваіх малышоў і зрабіць ім здымкі, — сказалі настаўніцы Эва Анішчук і Аліна Якімюк.

Матэвуш Харкевіч і Гжэгаж Дружба з Комплексу школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы адважна выступілі іграючы на акардэонах, а гайнаўскія белліцэісткі Бася Нядзельская і Малгажата Іванюк са школьнага тэатральнага гуртка „Драма", якім апякуецца настаўнік Ян Карчэўскі, удала выступілі з гумарэскай „На прыпынку". З такімі жартоўнымі сцэнкамі выступалі яны раней на музейных мерапрыемствах з цыкла „І там жывуць людзі". Удзельнікам сустрэч быў падрыхтаваны пачастунак. Пасля выступаў вучняў перад публікай запрэзентаваўся гайнаўскі гурт „Królik na uwięzi". Выступілі ў ім былыя гайнаўскія белліцэісты Пётр Пякарскі, Данель Юрчук, Марцін Кандрацюк і Адам Герасімюк, якія ў гэтым годзе атрымалі ўзнагароду публікі на гайнаўскім „Ракавіску". У музеі выступілі перш за ўсё з беларускім панкрокам.

Тэкст і фота Мацея ХАЛАДОЎСКАГА

У ПОШУКАХ ДУХУ

Кшыштаф Чыжэўскі і Малгажата Спорэк-Чыжэўская атрымалі ўзнагароду падляшскага маршалка ў галіне мастацкай творчасці, распаўсюджвання і захоўвання каштоўнасцей культуры

Аб тым, якую ролю займае месца (у разуменні прасторы) у сучаснай культуры ды неабходнасці і выніках яго адраджэння дэбатавалі ў г.зв. двары Мілаша ў Краснагрудзе непадалёк Сейнаў удзельнікі чарговага, сёмага ўжо сімпозіума „Варта паразмаўляць пра культуру". „Крызіс культуры, якога ў штораз мацнейшай ступені зазнае сучасны чалавек, пераламаць можа адраджэнне Месца. Ды што гэта значыць сёння — адрадзіць Месца? Штораз часцей сустракаемся з прыкладамі добраўпарадкавання, адбудавання, прыгадання ці рэвіталізацыі пакінутых, зруйнаваных, постіндустрыяльных месцаў, асуджаных на забыццё, экалагічна атручаных", — напісалі арганізатары ў запрашэнні на сёлетні сімпозіум.

У Краснагруду з'ехаліся — па ініцыятыве змешчанага ў Мілашавым дварку Міжнароднага цэнтра дыялогу — МЦД (заснаванага Асяродкам і Фондам культур, мастацтваў, народаў „Пагранічча") і Маршалкоўскай управы Падляшскага ваяводства — галоўным чынам падляшскія аніматары культуры і працаўнікі культурных цэнтраў. Паўтара дня (24-25 лістапада) абмяркоўвалася перш за ўсё адраджэнне месцаў, у якіх справа не толькі ў адбудове муроў, але і захаванні іх духу. Спецыяльнымі гасцямі сустрэчы былі архітэктарка, аўтарка шматлікіх інсталяцый у публічнай прасторы Аляксандра Васількоўская ды гісторык літаратуры, эсэіст, перакладчык і прафесар Варшаўскага ўніверсітэта Кшыштаф Руткоўскі, які шмат гадоў пражывае ў Францыі.

— Месца гэта не архітэктура, а тая прастора, дзе сустракаюцца людзі, — адзначала Аляксандра Васількоўская.

Расказала яна пра некалькі праектаў, якія шляхам мастацкага „ўмяшання" паўплывалі на характар месцаў. Прыгадала, напрыклад, перформенскае дзеянне, у час якога ўвялі мімаў на скрыжаванні забітай аўтамашынамі Баготы, і такім чынам, нічога новага не будуючы, змянілі рытм функцыянавання гэтых месцаў. У сваю чаргу ў Тбілісі звярнула яна ўвагу на месцы, якімі з'яўляюцца г.зв. каміказе-лоджыі, значыцць, будаваныя нелегальна, але масава, дабудоўкі да сцен будынкаў, выконваючыя таксама ролю месцаў для гандлю. Назвала гэтую з'яву „абмежаваным авалоданнем прасторай". Успомніла таксама ролю месцаў, якімі з'яўляюцца базары: „Гэта не толькі цэнтр гандлю, але і месца сустрэч. Трэба базарам вярнуць гэтую ролю".

Крыху па-правакатарску (асабліва па прычыне абавязваючай ад нядаўняга часу ў Польшчы забароны вулічнага гандлю) прагучала яе прапанова ўвядзення ў гарадах „базараматаў", які мелі б функцыянаваць падобна як паркаматы, дзякуючы якім за нейкую аплату можна было б нейкі час гандляваць на выдзеленым кавалачку тратуара. „Нямесцамі" назвала вакзалы і аэрапорты, на якіх штораз часцей мастакі будуюць інсталяцыі, выбіваючыя людзей з гэтых ананімных прастораў, і заахвочваюць да размоў паміж сабою. Пераламанню гэтай з'явы маюць служыць мастацкія інсталяцыі, якія рабіліся і якія плануюцца ў найбліжэйшай будучыні на і перад варшаўскім цэнтральным вакзалам, запраектаваным за геркаўскім часам Арсеніем Рамановічам якраз у духу ананімнасці, падобна як ягоныя іншыя (усе найважнейшыя) варшаўскія чыгуначныя вакзалы.

Кшыштаф Чыжэўскі падагуліў выступленне Аляксандры Васількоўскай:

— Гэта спроба вяртання супольнай прасторы.

Кшыштаф Руткоўскі адзначыў, што з першапачатковай дэфініцыі вынікае, што горад гэта месца, у якім жыве шмат людзей і яно аколенае мурамі:

— Дзякуючы мурам адчуваецца бяспека. Мур абараняе ад варвараў ці небяспечных звяроў.

Пры нагодзе ўспомніў пра першае гета (1515 г.), створанае ў Венецыі:

— Не было гэта месца ні цалкам закрытае, ні цалкам адкрытае. Венецыянскае гета давала магчымасць захаваць сваю тоеснасць. Венецыянцы хаваліся „ад", а яўрэйскае насельніцтва таксама „ад".

Адзначыў таксама:

— Месцы знікаюць, ды можна ў іх вяртацца, але з іншай энергіяй.

Спасылаючыся на паэта Мірона Бялашэўскага (аўтара „Дзённіка з варшаўскага паўстання"), сказаў:

— Энергія трымаецца ў зніштожаным месцы.

Дадаў:

— Трэба мець куды вярнуцца. Калі ў нас няма каранёў, мы заўжды ў дарозе. Гэта прыцягвае, ды найчасцей канчаецца шаленствам і самагубствам. Не ведаю ніякага канструктыўнага культурнага дзеяння, якое без укаранення ў традыцыі месца пратрымалася б больш чым дзесяць-пятнаццаць гадоў. Укараненне мусіць быць геаграфічнае, але і духоўнае.

У час дыскусіі Аляксандра Васількоўская адзначыла:

— У самым акце знішчання закладзены ўжо элемент будавання.

Кшыштаф Руткоўскі:

— Гэта турбота філосафаў ад пачатку свету: ці можна аднавіць тое, што ўжо знікла, ці можна выклікаць дух месца?

Як прыклад аднаго з адказаў на пытанне прывёў узор адрэстаўраванага Старога горада ў Варшаве:

— Гэты прыклад будавання бутафорый. Гэта не выкліканне духаў, а зданяў.

Аляксандра Васількоўская:

— Адбудова не можа абазначаць чыстай рэканструкцыі. Мусіць гэтаму месцу быць прыданае новае жыццё, нават тымі, хто не ведае, якім быў дух гэтага месца.

Кшыштаф Чыжэўскі звярнуў увагу на тое, што з паняццем месца звязана таксама паняцце вернасці:

— Праявай вернасці Мілаша было тое, што вярнуўся ў Краснагруду [сюды ў маладосці прыязджаў на канікулы да цётак; зноў прыехаў сюды першы раз на пачатку дзевяностых гадоў і разам з братам права на дварок перадаў „Пагранічча" пад заснаванне МЦД — М. Х.]. Чым далей ад'ехаў ад гэтага месца, тым больш быў з ім звязаны, думаў пра тое, каб вярнуцца.

Грамадскі дзеяч з Сейнаў Ежы Назарук:

— Нас пазбавілі фізічнага месца сустрэч. Жыллё, у якім мы сядзелі за адным сталом, замянілася ў клеткі, у якіх адварочваемся ў бок тэлевізараў. У школу дзеці прыходзяць як на фабрыку. Грамадства кажа: пара зноў будаваць святліцы. Можам гаварыць пра лад, калі дамо людзям фізічнае месца для сустрэч.

Аб такіх месцах сустрэч успаміналі м.інш. Дар'юш Скібінскі, арганізатар тэатральнага фестывалю „Вяртэп", які гасцюе ў мясцовасцях паўднёва-ўсходняй Беласточчыны (згуртаванне мае сядзібу ў вёсцы Палічна Кляшчэлеўскай гміны), Катажына Вінярская, вядучая стадольны тэатр у Тэрэміскаx ці Данута Курань з Народнага ўніверсітэта з сядзібай у той жа вёсцы.

— Калі ёсць такія месцы, якія нас ствараюць, мусім іх абараняць. Цяпер, у сувязі з сусветнай сітуацыяй, гэтая ідэя слушная яшчэ больш. Каді будуем дом, мусіць быць там месца для ўсіх і ўсе мусім быць яго сабудаўнікамі, — пераконвала Данута Курань (жонка Яцка Кураня).

Сімпозіум быў таксама нагодай для наладжання супрацоўніцтва ўстаноў са, здавалася б, „адлеглых" ад сябе месцаў. Дарафей Фіёнік, які вядзе Музей малой айчыны ў Студзіводах, напрыклад, наладзіў кантакт з Ядвігай Канопка, дырэктаркай Дома культуры ў Кнышыне. У размове з „Нівай" сказаў:

— У нас — супольная ідэя. Яны арганізуюць штогод агляд песень „Канапелька", а мы — „Па маёвай расе". Можам абменьвацца задумамі і іх вынікамі.

Спасылаючыся на тэму дэбаты, сказаў:

— Яна тлумачыцца вельмі рэальна. Цяпер адроджваю чацвёртае месца, чацвёрты дом. У гэты раз у Дубяжыне. Тут узнікае музей Дубяжынскай воласці. Ужо адроджаны дом прадзедаў Кандрацюкоў, у якім дзейнічае Музей малой айчыны. Пасля я адрадзіў дом Панасюкоў, звязаны з другой прабабкай, а яшчэ пасля — мяшчанскі дом. Каб дом аднавіць, прыходзіцца яго разабраць. Адбудоўваючы дом у Дубяжыне, у пыле я выпрацаваў імунітэт да вірусаў, заражваючыся імі. Тое разбурванне месцаў, аб якім тут успаміналі, для мяне вельмі рэальнае. Кожны раз, калі бяруся за разбурванне і будаванне дома, думаю аб продках, каб яны мне дапамаглі. Ведаю, што раблю штосьці добрае для іх. Яны сюды ўкладвалі сваё сэрца, тут стваралася іхняя гісторыя, тут хтосьці прыйшоў на свет, той хто пасля даў жыццё мне. І гэта ёсць дух гэтых месцаў.

Мы неадкладна выкарысталі дэбату „Паразмаўляйма пра культуру", каб паставіць пытанне ў маштабе менш духовым, значыць, пра грошы на культуру на наступны год у самаўрадавым бюджэце Падляшскага ваяводства. Маршалак Яраслаў Дважанскі:

— Пакуль яшчэ гаворым пра нейкі праект бюджэту, дык я не хацеў бы гаварыць пра канкрэтныя сумы. Ды несумненна падляшскі ваяводскі самаўрад з ліку ўсіх ваяводскіх самаўрадаў у Польшчы вызначае адну з найбольшых сум якраз на культуру.

Анатоль Вап, дырэктар дэпартамента культуры і нацыянальнай спадчыны МУПВ:

— Ацэньваючы мінулагодні і цяперашні бюджэты, наступае значны рост сродкаў накіраваных на культуру. У падлеглых нам установах культуры, без інвестыцый, гэта рост на чатыры працэнты, а на апошнюю культурную дзейнасць — рост у пяць працэнтаў. Датычыць гэта так павятовых, гмінных, як і няўрадавых арганізацый.

Мы распытвалі ў дырэктара Вапа на колькі грошай могуць разлічваць у будучым годзе арганізацыі нацыянальных меншасцей падляшскага рэгіёна на мерапрыемствы культурнага характару:

— Цяжка цяпер ацаніць, ці нацыянальныя меншасці атрымаюць больш. У бюджэце маем запісаны прыярытэт: падтрымка нацыянальных меншасцей. Тут рост невялікі (на 10 тысяч зл.) Пакуль цяжка меркаваць, на колькі грошай агулам меншасці могуць разлічваць, бо маюць шанцы таксама падаваць заявы на датацыі з іншых прыярытэтаў і гэта залежыць ад актыўнасці меншасцей і заяў, якія яны пададуць. Да гэтай пары рыхтавалі яны вельмі каштоўныя праекты і заявы былі вельмі добра падрыхтаваныя з фармальна-юрыдычнага боку.

Удзельнікі краснагрудскага сімпозіума паглядзелі м.інш. прэзентаваную ў дварку выставу рысункаў Анджэя Струмілы, інспіраваных апошнімі вершамі Чэслава Мілаша ды прынялі ўдзел ва ўручэнні сёлетняй узнагароды падляшскага маршалка ў галіне мастацкай творчасці, распаўсюджвання і захоўвання каштоўнасцей культуры. Атрымалі яе стваральнік МЦД Кшыштаф Чыжэўскі і Малгажата Спорэк-Чыжэўская за „ўпартасць і паслядоўнасць у будаванні мастоў над падзеламі".

Тэкст і фота Іаанны ЧАБАН

Гісторыя маёй хаты

Амаль сорак гадоў жыцця правяла я ў блізкіх вандроўках і тулянні па белым свеце. У гэтым не адрознівавалася ад сваіх продкаў, якіх лёс кідаў ад глыбокай Расіі да заходняй Нямеччыны. Слава Богу, неяк два гады таму, здаецца, я знайшла сваё месца на зямлі, што, як мне вядома, з'яўляецца адным з найвялікшых жыццёвых дасягненняў любога чалавека.

Яно знаходзіцца на апошнім усходнім кіламетры Польшчы, непадалёк распаложаны Грабшаў лес і лугі, на якіх пасвяцца крынкаўскія бараны і коні, а ў найбліжэйшым суседстве дажываюць сваіх апошніх дзён драўляныя хацінкі і шопкі. У свой невялікі домік я закахалася з першага пагляду. Ён рабіў ўражанне святыні, напоўненай дастойнасцю і павагай. Напаленая вялікая пліта з печкай здавался быць апякунчай гаспадыняй, дабратворна дамінуючай на усімі чалавечымі пачуццямі.

Хатку купіла я ад крынкаўскай сям'і Моршчынаў, нашчадкі якіх параскідваны па найдалейшых кутках заходняй Польшчы.

Васіль Моршчын ажаніўся з Ксеніяй Каліш з падкрынкаўскай вёскі Саннікі. У 1933 годзе выкупіў кавалак зямлі ад продкаў маіх суседзяў Майсюкоў, на якім пабудаваў згаданы дамок. З успамінаў найстарэйшых жыхароў Крынак ведаю, што жылі яны ў лобоўі, згодзе і дастатку. Дамок быў вельмі прыгожы, з ганачкам, панадворак патанаў у кветках, якіх даглядала гаспадыня. У іх нарадзілася двух сыноў Уладзімір і Рыгор, якога звалі Горыкам. Васіль быў адзіным крынкаўскім хрысціянінам, які ў міжваенны перыяд здолеў купіць сабе радыёпрыёмнік. Сходзіўся да яго мнагалікі народ, каб паслухаць тады выключна польскамоўных перадач, між іншым, пра нямецкую бамбардзіроўку Польшчы. Людзі кажуць, што Васіль трымаў прыгожага каня, на якім па-майстэрску ганяўся, надзеўшы казацкую папаху з аўчыны. Гаспадар, будаўнік маёй хаты, быў царскім есаулам, меншавіком, які ў 1920 годзе далучыўся да атрада генерала Станіслава Булак-Балаховіча, каб бараніць Беларускую Народную Рэспубліку. Ягоны ваенны ранг быў такі самы як з папярэдняй царскай арміі. З гэтай пары Васіля ў Крынках сталі называць Балаховічам. Нядоўга Ксеня і Васіль цешыліся сямейным шчасцем. Бальшавікі вывезлі яго ў 1939 годзе ў Сібір на катаргу, з якой ужо ніколі не вярнуўся. Ксеню з маленькімі Уладзімірам і Горыкам забрылі тыдзень пазней у далёкую Кіргізію. Узялі іх раптам, не далі нічога забраць з сабою. Нажылася яна там страшэннай бяды і пакут, начавала ў ляпянках, працавала між іншым у млыне, але страшэнны голад прымусіў яе красці хлеб, каб накарміць хлопчыкаў.

Падчас адсутнасці гаспадароў, у маленькую хатку адразу пераехалі тры сям'і: міліцыянта, чырвонаармейскага афіцэра-лётчыка і бацькі аднаго з сённяшніх суседзяў — галавы ячэйкі КПЗБ. Усім раздзялілі па пакойчыку, кухняй карысталіся супольна. Потым у доме пасяліўся настаўнік крынкаўскай школы — спадар Кулакоўскі.

Ксеня здолела ў пяцідзесятыя гады вярнуца з дзецьмі ў родную хату. Яна ўжо ніколі больш не выходзіла замуж, астаючыся вернай любові свайго жыцця. Вяла манаскі вобраз жыцця, многа малілася, чытала царкоўную літаратуру на стараславянскай мове. З суседзямі ў плёткі не ўмешвалася, замест таго чытала ім уголас свае кніжкі. Ва ўспамінах людзей назаўсёды засталася асобай інтэлігентнай і вельмі элегантнай у выглядзе і паводзінах. У хаце заўсёды трымала парадак і чысціню, панаваў там вялікі мінімалізм. Застаючыся пад уплывам трагічнага мінулага, Ксеня рашыла нічога больш не набываць, ложак і іншую простую мэблю купіла ёй суседка. Каб выкарміць і вывучыць сваіх дзяцей, Ксеня ўладкавалася на працу ў крынкаўскім шпіталі. Хлопцы хутка павырасталі, пайшлі ў сляды бацькі, робячы вайсковыя кар'еры; Валодзя служыў генералам у Вроцлаве, а Горык як капітан флоту плаваў па ўсім свеце, вяртаючыся на рэдкія выхадныя да сваёй жонкі, што чакала яго ў Шчэціне. Да Ксені з далёкага свету з'язджаліся ўнукі.

Жыццё рыхтавала Ксені чарговае мора слёз. Перажыла яна самы агромны, здавалася б, невыносны боль па страце двух дарагіх сыноў. Усё-такі вера ў Бога дапамагла ёй дажыць з гонарам да глыбокай старасці. Ксеню пахавалі на крынкаўскіх могілках.

Лёс дазволіў мне выратаваць апушчаную, схіляючуюся ў руіну хатку Ксені і Васіля Моршчынаў. Што больш, я, не ведаючы яшчэ нічога пра яе шаноўных гаспадароў (пасля смерці Ксені людзі павыносілі з хаты ўсё, што можна было вынесці), я падсвядома працягвала падтрымліваць аўтэнтычны дух і клімат гэтага месца. Тут, як і раней, няма выпадковых і лішніх прадметаў. Па-калісьняму збіраецца сціплая старая мэбля, фатаграфіі, кніжкі і іншыя вельмі важныя для мяне рэчы, якія сведчаць пра сапраўдную гісторыю і культуру Крынак і наваколля. Яны, як і сама хата, былі пакінуты і забыты, нікому непатрэбныя, не выяўляючы сабою ніякай каштоўнасці ні ўвагі. На мне спачыў абавязак зберагання не толькі матэрыяльнай культуры, але перш за ўсё доўг памяці людзей, якія пасля сваёй смерці адорылі мяне гісторыяй іхняга жыцця, бо перадаць гэтага не было каму. Таму іх імёны назаўсёды застануцца ў маім сямейным памінальніку.

Цяпер, у эпоху развітога інтэрнэту, ужо мала каго можна здзівіць наяўнасцю сайта таго ці іншага горада. Больш таго, наўрад ці на прасторах еўрапейскага кантынента можна знайсці горад, які б меў менш за два такія сайты. Гэта зразумела — канкурэнцыя, дасягальнасць інтэрнэту, лёгкасць стварэння інтэрнэт-бачыны дазваляюць стварыць сайт без якіх-небудзь сур'ёзных намаганняў. У некаторых краінах, як, напрыклад, у Беларусі, для не праўрадава настроеных грамадзян інтэрнэт застаецца не толькі амаль адзінай крыніцай незалежнай інфармацыі, але і месцам, дзе можна выказаць свае ўласныя думкі, размясціць уласны артыкул, пазнаёміцца з меркаваннямі такіх як і ты апазіцыйна думаючых людзей. І бачыцца вельмі неблагой рэччу магчымасць стварэння такога незалежнага сайта не толькі на агульнанацыянальным, але і мясцовым узроўні.

Адным з прыкладаў нядрэннай рэалізацыі такой магчымасці з'яўляецца сайт, прысвечаны беларускаму гораду Светлагорску (былым Шацілкам), што знаходзіцца ў Гомельскай вобласці на паўднёвым усходзе краіны. Сайт месціцца ў інтэрнэце па адрасе **http://svetlahorsk.belarda.org** і мае аднайменную з горадам назву. Пабудаваны ён даволі проста і зразумела — тры звыклыя часткі выяўлення, з левага боку — выйсці да рубрык, з правага — малазначная інфармацыя пра некаторыя артыкулы (кшталту, колькі было праглядаў і колькі ёсць каментарыяў), а пасярэдзіне — асноўныя артыкулы пра мясцовыя светлагорскія і агульнаабласныя падзеі.

Нягледзячы на тое, што сайт для Светлагорска неардынарны, бо ў беларускай глыбінцы кожны незалежны партал — справа неардынарная, яго стваральнікі і ўладальнікі не парупіліся пра тое, каб неяк абазначыць сябе. Няма аніякай інфармацыі хто і дзеля чаго стварыў даны сайт, каму ён цяпер належыць, што менавіта хоча данесці сваім чытачам.

Праглядзеўшы ўважліва артыкулы, якія месцяцца на галоўнай старонцы, прыходзіш да высновы, што з большага сайт мае праваабарончую накіраванасць. Аб гэтым, прынамсі, сведчаць артыкулы, узятыя ад праваабарончага цэнтра „Вясна" — „У Рэчыцы затрыманы сябра БХД Кастусь Змушко", „Суд адмовіў мазырскаму праваабаронцу ў праве на свабоду сходаў", „Заява сяброў Праваабарончага цэнтра „Вясна", якая тычыцца зняволення іх кіраўніка Алеся Бяляцкага па палітычнай замове ўлады".

Разам з тым на сайце размешчана і даведачная інфармацыя, якая можа быць карыснай для вандраўнікоў і турыстаў, маючых намер трапіць у Светлагорск. Так, на старонцы „Горад і раён" мы знойдзем гістарычныя звесткі пра даную мясцовасць, пералік бліжэйшых вёсак і пасёлкаў, паглядзім на гербы і сцягі Светлагорска і некаторых тамтэйшых населеных пунктаў, пабачым светлагорскія цэрквы і касцёлы.

Даволі падрабязна падаюцца расклады маршрутаў як мясцовай камунікацыі, так і праходзячых праз Светлагорск цягнікоў і аўтобусаў, што накіроўваюцца ва ўсе суседнія краіны.

Нягледзячы на ананімнасць, уладальнікі сайта прадугледзелі магчымасць звароту да іх праз старонку „Напісаць ліст" альбо праз наведванне „Гасцёўні". У апошняй пакуль няма аніякага водгуку, што хутчэй за ўсё і звязана з таямнічасцю сайтавай адміністрацыі.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

С БЕЛАРУСІ к а р б ы

Асяродкі Цёткі

Мінае ўсяго нейкіх сто ці сто пяцьдзесят гадоў і некаторыя мясціны знікаюць з твару зямлі назаўсёды і незваротна. Асабліва, калі па зямлі гэтай пракочваюцца шматлікія войны і вядзецца разбуральная дзейнасць уладароў над тэрыторыяй і людзьмі. Так здарылася і з родавым маёнткам беларускай паэткі Цёткі, народжанай Алаізы Пашкевічанкі. Дзе быў некалі фальварак пад назвай ні то Пешчын, ні то Пясчына, сёння не ведае ніхто. Была гэтая мясціна на тэрыторыі сённяшняга Шчучынскага ці Гарадзенскага раёнаў і вызначыць яе магла б толькі адмысловая археалагічная экспедыцыя, але ніхто пакуль не наважваецца яе правесці — ці звестак зусім няма, ці зацікаўлення.

Цётка стала першай беларускай паэткай новага стагоддзя. Яна была ў цэнтры тых асяродкаў, якія рыхтавалі хвалю нацыянальнага абуджэння і адраджэння, была адной з пачынальніц многіх арганізацый. Алаіза абрала такі псеўданім хутчэй усяго таму, што нашай пакутнай зямлі, сапраўднай сіраціне, востра бракавала „цеплыні" і „пяшчоты", якую можна было б атрымаць менавіта ад роднай цёткі. Што датычыць яе іншых, пераважна мужчынскіх псеўданімаў (Мацей Крапіўка, Гаўрыла з Полацку, Тымчасовы...), то гэта ва ўмовах пераследу і сачэння рабілася, канешне, з мэтай канспірацыі.

Вобраз Цёткі прыйшоў мне ў галаву на львоўскім чыгуначным вакзале, дзе на вялікім экране круціўся рэтра-кліп да юбілею мясцовай жалезнай дарогі. У горад прыбывае цягнік і на пероне сустракаюцца двое закаханых маладых людзей. Так магла чакаць, сустракаць кагосьці і незамужняя яшчэ Алаіза, якая прыехала ў сталіцу Галіцыі (у гэтым цудоўным горадзе пакінулі сляды розныя беларусы, ёсць нават вуліцы Францішка Скарыны і Янкі Купалы) з Вільні, ратуючыся ад пераследу. Што мы ведаем пра яе асабістае жыццё — зусім мала... У Львове Цётка паступіла на філасофскі факультэт мясцовага ўніверсітэта, тое ж было і ў Кракаве. Здзіўляе яе памкненне да навукі, якое можна параўнаць з яе прагай да вольнасці роднага краю. Што датычыць творчасці, то часцяком Цётку просталінейна разглядалі выключна як рэвалюцыянерку, бунтарку і аўтарку пракламацый-адозваў. Узгадаем хоць бы славуты „Хрэст на свабоду". Але ў яе вершах таксама надзвычай многа іншых фарбаў і кветак. Невыпадкова верш „Лета", дзе і нарцыса, і вяргіня, і лілея, і пралеска, стаў у наш час папулярнаю песняй пра дзяўчыну Касю.

Шляхі Цёткі пралягалі праз Вільню і Пецярбург, Кракаў і Львоў, Мінск і Закапанэ, Фінляндыю і Швецыю. І ўсюды, дзе толькі было магчыма, яна была ў эпіцэнтры беларускіх асяродкаў, чынна ўплываючы на іх актыўнасць. Ахвярнасць Цёткі ўражвае. Церпячы матэрыяльныя нястачы, яна аддае ўсе свае сілы працы, дапамозе іншым. Яна прыкладае шмат высілкаў для арганізацыі беларускіх школ і настаўніцкіх курсаў у Вільні. Разуменне значнасці беларускай адукацыі натхняе яе на стварэнне для новага пакалення „Лемантара", „Гасцінца для малых дзяцей", „Першага чытання для дзетак беларусаў". Яна дапамагае ў стварэнні прытулкаў, як сястра міласэрнасці даглядае хворых у тыфозным бараку. У 1916 годзе памёр бацька, і Алаіза едзе на пахаванне. У наваколлі якраз лютавала эпідэмія. Алаіза, якая раней пакутавала на сухоты, застаецца дапамагаць хворым. Гэта было ўжо фатальна...

Месца апошняга спачыну Цёткі вядомае дакладна. Хоць розныя крыніцы падаюць альбо вёску Шастакоўцы альбо Стары Двор — гутарка ідзе пра адно. Пры дарозе са Старога Двара да Астрыны невялічкі вясковы мемарыял, аздоблены сціпла, але адпаведна жыццю руплівай дачкі гэтай старонкі.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Тэкст і фота Уладзіміра СІДАРУКА

У Дубіцкай гміне

У Дубічы-Царкоўныя трапіў я невыпадкова. Калі прачытаў на сайце аб стогадовым юбілеі Зіновіі Гіль, пазваніў у гміну.

— Бабулька добра сябе адчувае, — сказаў войт Лявон Малашэўскі. — Можна пагаварыць. Прыязджайце...

У падарожжа сабраўся я ў чацвер 10 лістапада. А 9:25 адправіўся рэйкавым аўтобусам з Чаромхі ў Вітава, затым на ровары ў Дубічы-Царкоўныя. Даўно не карыстаўся гэтым шляхам.

У мінулым была тут жвіроўка ненайлепшай якасці. Зараз пакладзена асфальтнае палатно. Праўда, гэта не асфальт, а насціл з бітумічнай масы, але дарога цвёрдая, хоць кацісь! Праз няпоўныя дваццаць мінут пад'язджаю ў вёску. На вуліцы сустрэў Мікалая Панфілюка. Абмяняліся навінкамі. Затым загаварылі пра „Ніву".

— Чаму не пішаш? — пытаю.

У адказ пачуў:

— Паслаў некалькі вершаў у студзені. Не надрукавалі. Больш не пасылаю...

У апошніх словах адчуваліся сум і горыч. Не пазнаваў я даўнейшага прыяцеля схільнага да гаворкі і спрэчак. Калі мы вялі размову, пісьманосец перадаў сябру свежы экземпляр „Нівы". Мікалай заявіў:

— А на „Ніву" штогод падпісваюся. З першай па апошнюю старонку чытаю...

Развітваюся з сябрам. Раблю яму памятныя здымкі ў знак прызнання і супольнай дружбы. Затым падаюся ў гміну. Аднак войта не заспеў.

— Зранку быў, — патлумачыла чыноўніца, — але вымушаны быў выехаць. Каля трэцяй вернецца...

Не стаў я чакаць войта. Знаёмлюся з сакратаром Гміннай управы Мікалаем Ляўчуком. Размову пачынаем з бюджэту і гмінных інвестыцый.

Мікалай Панфілюк

— Дубіцкая гміна лічыцца самай меншай у Падляшскім ваяводстве і знаходзіцца на першым месцы „да адстрэлу", — заявіў суразмоўца. — Бюджэт у нас невялікі. Сёлета складае ён суму 6 209 680 зл. на баку прыбыткаў і 7 523 818 зл. на баку выдаткаў. Дэфіцыт будзе пакрыты з вольных сродкаў і банкавых крэдытаў. Нягледзячы на сціплы бюджэт, — працягвае субяседнік, — паспяхова рэалізуем назначаныя задачы. Асноўнай інвестыцыяй з'яўляецца рамонт воднага басейна на рэчцы Арлянцы ў месцы адпачынку „Бахматы". Кошт інвестыцыі 970 тыс. злотых, пры тым пакарыстаемся еўрасаюзнымі сродкамі ў суме 630 тысяч. Інвестыцыя рэалізуецца ў рамках Рэгіянальнай аперацыйнай праграмы Падляшскага ваяводства 2007-2013 (РАППВ). Купілі мы ўжо байдаркі, водныя ровары, маторныя і веславыя лодкі, лыжы з ботамі, трактар з газонакасілкай, падрыхтавалі пляцоўку для дзіцячых гульняў.

Чарговай інвестыцыяй з'яўляецца пабудова 64 прысядзібных ачышчальняў сцёкаў. Кошт — 900 тыс. зл., прытым пакарыстаемся 540 тыс. зл. еўрасаюзнай дапамогі. Кошт адной ачышчальні — 14 тыс. зл. Найбольш іх будзе пабудаваных у салэцтве Войнаўка — 13, затым 7 у Ягадніках на калёніі...

Перабудова і разбудова Гміннага асяродка здароўя (закупка абсталявання ў рамках дастасавання да саюзных нормаў) паглыне 520 тыс. зл. (340 тыс. зл. еўрасаюзных сродкаў). У рамках згаданай інвестыцыі адноўлены тры памяшканні, купілі ультрасанограф і кардыёманітор з дэфібрылятарам.

У рамках праграмы „Лідар" вядзецца рамонт вясковай святліцы ў Карыцісках. Сёлета праводзіліся работы звонку (кошт — 100 тыс. зл., еўрасаюзныя сродкі 37 тыс. зл.). Рамонт унутры прадбачваецца ў наступным годзе ў рамках праекта РАППВ. Праект ужо адобраны і гэтымі сродкамі пакарыстаемся пры рамонце святліцы ў Старым Корніне.

У мінулым годзе ў рамках Нацыянальнай праграмы перабудовы лакальных дарог быў мадэрнізаваны паўтаракіламетровы адрэзак дарогі Вэрсток — Вілюкі. Кошт інвестыцыі склаў больш за 300 тыс. злотых. Палова гэтай сумы была кампенсавана еўрасаюзнымі сродкамі.

Паказаныя прыклады інвестыцый сведчаць аб аператыўнасці мясцовага самаўрада. Ды не толькі гэта заслугоўвае ўвагі. Дубічы змяніліся да непазнавальнасці. Была пабудавана пагранічная застава. Паспяхова працвітае дзейнасць у мясцовым цэнтры культуры, а людзі адпачываюць у курортным месцы на „Бахматах". Відаць тут цывілізацыйны прагрэс апошніх гадоў.

Адгаданка

1. еўрааазіяцкая дзяржава, 2. Аркадзь, беларускі паэт (1914-78), 3. аб'ява аб спектаклі, канцэрце, 4. квадрат дзесяці, 5. павозка, якая прычэпліваецца да самахода, 6. марскія хвалі, якія абіваюць бераг, 7. трэцяя частка цэласці, 8. вялікі касцельны музычны інструмент, 9. горад на поўначы Малдовы на рацэ Рэўт , 10. квадратны корань з дзевяці, 11. складаны арнамент арабскага стылю, 12. загляне і ў наша аконца, 13. вялікі гармонік, 14. узнагарода, 15. гарадскі пасёлак на беразе Асвейскага возера, 16. фурманка, 17. доўгі высокі земляны насып, 18. сталіца Паўднёвай Карэі, 19. эдэм, 20. арганізаваны вываз насельніцтва з-пад пагрозы, 21. расліна сямейства бабовых, 22. польская гербавая птушка, 23. думка, 24. апалячванне, 25. брат Авеля, 26. арэол, 27. назва прадстаўнічых устаноў у некаторых краінах, 28. самалюбства.



Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — страфу Славаміра Адамовіча. **(ш)**

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 44 нумара

Паставы, змей, палын, лось, яр, як,ікс, кавыль, Лія, пул, Ліван, цюбік, цана, быль, выгада, юрта, рыс, ніць, рак.

Рашэнне: **Словы як яйкі — калі яны вылупліваюцца, набываюць крылы**.

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Мікалаю Сазановічу** з Навін-Вялікіх і **Лукашу Пацэвічу** з Беластока.

04.12 — 10.12

(22.03. — 20.04.) Да 7.12. ніхто не міне цябе абыякава, на супрацьлеглы пол дзейнічаеш як магніт! 6-10.12. даможашся шляхам перамоў усяго, чаго толькі захочаш. 10.12. хтосьці нясмелы можа табе нагаварыць усяго пры ўсіх, а хітрун схоча табе зашкодзіць (у пару пазбегнеш пагрозы). Аж да 20.12. твой поспех будзе паганяць поспех!

(21.04. — 21.05.) Зрэалізуеш усё, аб чым марыш. Да 7.12. зоркі папхнуць цябе да яшчэ большага дзеяння (старайся як найбольш зрабіць у першай палове месяца). Знакаміта пакажашся на розных сустрэчах. Ды не дай прымусіць сябе да таго, да чаго не маеш ахвоты.

(22.05. — 22.06.) Зоркі памогуць увайсці табе ў новае атачэнне. Пазнаюць цябе як душу кампаніі ды жартаўніка. Ды да 7.12. завінціцца кран з грашыма. Кепска ацаніўшы магчымасці, можаш шмат страціць; пакуль не інвестуй, асабліва 10.12. — не дамаўляйся на сустрэчы, ад якіх будзе залежаць твае жыццё.

(23.06. — 23.07.) Зіма табе нястрашная, грэць цябе будуць энтузіязм і жыццярадаснасць. Смелыя задумы зрэалізуеш без вялікага высілку. Ды поўня і зацьменне Месяца 10.12. прынясуць крыху замяшання, няясныя апаскі і турботы; не паддавайся эмоцыям. 5-9.12. будзеш мець знакамітыя нагоды, якія абавязкова выкарыстай, бо цяпер можаш зрабіць крок да цудоўнай будучыні!

(24.07. — 23.08.) У гэтым месяцы разагрэюць цябе гарачыя эмоцыі і жарсці. Засяродзішся на дзеянні і зробіш тое, што іншыя лічаць немагчымым. Ды спачатку пагражае табе адкрыты канфлікт; не ўпірайся на сваім і не спальвай за сабой мастоў.

(24.08. — 23.09.) Будзеш вельмі баявіты, хуткі і ўдачлівы Ды аж да святаў будуць да цябе даходзіць супярэчлівыя весткі. Да 7.12. не панікуй, калі цябе хто скрытыкуе; не пераймайся. 10.12. могуць ускладніцца суадносіны з атачэннем; падлізнікам няварта давяраць.

(24.09. — 23.10.) Будзеш адважны і самаўпэўнены, будзеш карыстацца папулярнасцю ў іншага полу. Не дазволіш чужым перакрочыць твае межы. Не абманутць цябе прадаўцы і рэкламнікі. На працы зробіш тое, што трэба, хоць можа не будзеш узорам працаўніка; але могуць падкінуць табе асоб для абучэння і практыкі. Парабі даследаванні свайго здароўя, хоць на яго не наракаеш.

(24.10. — 22.11.) Будзеш мусіў пааддаваць даўгі (не бойся, не пойдзеш з торбамі); знойдзеш дадатковы заробак. Дасягнеш раўнавагі душы, убачыш свет у светлых колерах. Ды 10.12. можа падвесці цябе інтуіцыя; не пазычай нікому грошай, бо доўга іх не пабачыш.

(23.11. — 22.12.) Будзеш непераўзыдзены на працы, у школе ці дома; мноства энергіі!!! Ды і твая галава працуе на ўсю катушку! Будзеш узорам! Да 9.12. будзеш вельмі моцны. Аж да 20.12. будзеш вясёлы і дасціпны; шчасце ідзе за табою крок у крок. Ды 10.12. могуць турбаваць цябе складанасці ў пары, асабліва ў сужонстве.

(23.12. — 20.01.) Цяжкі ўплыў зорак! Момантам будзеш адчуваць, што не маеш уплыву на сваё жыццё. Дзве першыя дэкады месяца — не вельмі прыемныя, бо згруваздзяцца праблемы, на якіх няма простага рашэння. 10.12. будзе табе цяжка лагічна думаць і дзейнічаць; не паддавайся. Давярай лёсу і плыві з цячэннем.

(21.01. — 19.02.) 10.12. замяшанне ў пачуццях, можаш кепска вырашыць; нікому нічога не абяцай! Лягчэй будзе з гарачым раманам, чым з сур'ёзнымі планамі. А будзеш вельмі падабацца, дык шмат хто можа ў цябе ўлюбіцца (не забаўляйся з чыімісь пачуццямі!). Ды найбольшую прыемнасць прынясуць табе... пакупкі.

(20.02. — 21.03.) Не зачыняйся ў хаце! Цяпер можаш паказацца з найлепшага боку. Гэты месяц прынясе табе новыя шанцы. Нават калі няма ў цябе вялікага досведу, можаш зайсці далёка. Хоць спачатку можаш мець благі настрой, будзеш раздражнены, злосны; непаразуменні ў пары ці ў сям'і гарантаваныя!

Агата АРЛЯНСКАЯ

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.

Публіцысты: Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк, Янка Целушэцкі.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Sprzedaż egzemplarzową „Niwy" prowadzą: kioski i punkty sprzedaży „RUCH" na terenie woj. podlaskiego oraz w Warszawie (odbiór należy zgłosić u sprzedawcy wybranego kiosku lub punktu sprzedaży „RUCH"), placówki pocztowe i listonosze w woj. podlaskim, siedziba redakcji „Niwy".
Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty.
Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH" i „KOLPORTER" na terenie całego kraju.
Cena prenumeraty kwartalnej — 32,5 zł., półrocznej — 65 zł., rocznej — 130 zł.
Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A. ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734
Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy" w 2011 roku — 52.
Przesyłka zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 4,2 zł.
Wpłaty przyjmuje: Rada Programowa Tygodnika „Niwa",
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945
Nakład: 1 300 egz.

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

У Махнатым беларускі калектыў

У Махнатым у шасцідзесятых гадах дзейнічаў музычны калектыў. Заснаваны ён быў пры Школе сельскагаспадарчай падрыхтоўкі. Былі ў ім музыканты, якія іграли на вясковых гуляннях і вяселлях. У мінулым вёска была расспяванай так, як і суседнія сёлы. Тады нашы людзі спявалі ў час святкаванняў і за працай. Цяперашні солтыс і заадно гмінны радны Аляксей Герасімюк і Сяргей Кучка з Махнатага належалі да тадышняга калектыву, што дзейнічаў прыблізна каля пяцідзесяці гадоў таму. Яны і цяпер з'яўляюцца падпорай цяперашняга вясковага вакальнага калектыву, які першы раз публічна запрэзентаваўся позняй вясной гэтага года і выступіў ужо разоў пяць перад публікай Гайнаўскай і Чаромхаўскай гмін.

Здабыўшы крыху вопыту, калектыў 26 лістапада ўдала запрэзентаваўся ў Махнатым у прыгожа адрамантаванай святліцы. Можна сказаць, што была гэта інаўгурацыя яго дзейнасці перад жыхарамі сваёй вёскі. Выступіць на запусным канцэрце запрошаны былі калектывы „Чыжавяне" і „Незабудкі". Праўда, вясной гэтага года, адразу пасля першых рэпетыцый, была спроба выступу гэтага гурту разам з калектывамі з Беларусі ў Махнатым у рамках фестывалю „Там по маёвуй росі", але тады вялікая бура разагнала сабраных. Цяпер, у адносна цёплы як на лістапад вечар, сабраліся ў вялікай зале клуба жыхары Махнатага, прыбылі таксама выхадцы з гэтай вёскі і людзі з суседніх сёл. Хаця на тварах махнацкіх спевакоў відаць было хваляванне, то адначасна іх выступ быў адважным і на прыстойным мастацкім узроўні, якога калектыў дабіўся ўжо на працягу паўгадовай дзейнасці.

Ідэю заснавання калектыву пахваліла войт Гайнаўскай гміны Вольга Рыгаровіч, ураджэнка Махнатага. Разам з войтам былі старшыня БГКТ Ян Сычэўскі, які хваліў жанчын і мужчын з Махнатага за спяванне „з сэрцам" і за вялікі энтузіязм, старшыня Рады Гайнаўскай гміны Веслаў Камарэўскі, кіраўнік Гміннага асяродка культуры ў Дубінах Раіса Кот і радная са Старога Беразова Галіна Дзікевіч. Канцэрт распачаўся з песні „Вішнёвы сад", а закончыўся творам „Цячэ вада ў ярок".

— Ідэя заснавання вакальнага калектыву ў нашым сяле выйшла ад мяне. Рашэнне было прынята ў апошнім тыдні перад Вялікаднем. Я ўжо і раней думаў заснаваць калектыў у Махнатым, але не ведаў інструктара і заадно акардэаніста, які змог бы вучыць правільна спяваць і заадно акампанаваць нам. Спачатку думаў пагаварыць з інструктарам „Чыжавян", але пасля мы рашыліся на супрацоўніцтва з Пятром Скепкам, які займаецца з „Нараўчанкамі". Заснаванне калектыву мы абмеркавалі ў крузе некалькіх асоб, а пасля Вялікадня я стаў прапанаваць жыхарам далучыцца да музычнага калектыву. Расклеіў аб'явы ў Махнатым. Водгук жыхароў быў станоўчы. Мы хутка сабралі ахвотных спяваць і сталі ладзіць першыя рэпетыцыі, — сказаў галоўны арганізатар калектыву, солтыс Аляксей Герасімюк. Успомніў ён як бура і дождж спынілі першы выступ калектыву ў Махнатым у час фестывалю „Там по маёвуй росі". — Другі раз мы выступілі ў ліпені на фэсце ў Старым Беразове, пасля восенню спявалі ў Ліпінах на мерапрыемстве пячэння бульбы і на фэсце ў Баброўцы. Нядаўна спявалі мы ў Дубінах на падвядзенні вынікаў конкурсу на найпрыгажэйшы агародчык. Апошнім часам рыхтываліся мы да выступу перад сваёй публікай у Махнатым.

Выступ вакальнага калектыву з Махнатага пахвалілі знатакі спеву, а публіка горача апладзіравала (Аляксей Герасімюк другі справа)

Сола выступіла Марыя Мароз (спераду), а мерапрыемства цікава вяла Анна Іванюк (злева)

У вакальным калектыве людзі ва ўзросце ад 24 да 70 гадоў. Побач Аляксея Герасімюка і Сяргея Кучкі выступаюць у калектыве Люцына Кучка, Дарота Раманюк, Уладзіслаў Раманюк, Міраслава Клімюк, Вячаслаў Клімюк, Крысцінія Красько, Анна Іванюк, Аляксандра Іванюк, Анна Сваток, Марыя Мароз і мастацкі кіраўнік Пётр Скепка.

— Я любіцель спявання ад дзяцінства і, хаця ёсць яшчэ ў мяне свае абавязкі, рашыўся ўступіць у калектыў, каб з песнямі адпачываць ад штодзённасці. Калі будзе яшчэ здароўе, хацеў бы сваім спевам успамагаць наш гурт, — сказаў найстарэйшы ўдзельнік калектыву Сяргей Кучка.

— Мне вельмі падабаецца атмасфера ў калектыве і нам цудоўна супольна спяваецца, — заявіла наймалодшая ўдзельніца калектыву Аляксандра Іванюк, дачка Анны Іванюк, якая цікава і на беларускай літаратурнай мове вяла канцэрт.

— Я многа гадоў жыла ў Гданьску, там ангажавалася ў дзейнасць БГКТ, а пасля ў дзейнасць Беларускага таварыства „Хатка" і многа гадоў спявала ў тамашнім беларускім калектыве „Жаваранкі". Калі тут пачаў арганізавацца вакальны калектыў, я з вялікай ахвотай уступіла ў яго, бо вельмі люблю спяваць, а з-за хваробы маці, якой зараз апякуюся, зноў жыву ў Махнатым, — сказала Анна Іванюк, якая пастаянна спявае таксама ў царкоўным хоры ў Старым Корніне. — Калі пачаў арганізавацца калектыў, нашы людзі вельмі ахвотна адгукнуліся. Ізноў пачалі гучаць у нас песні. Наш мастацкі кіраўнік Пётр Скепка вельмі ахвярна займаецца з намі, каб як мага найлепш падрыхтавацца да выступленняў. Маем надзею прыцягнуць у калектыў яшчэ больш маладых людзей. Уступна прыдумалі мы назву для нашага ансамбля — „Жаваранкі".

Пацвердзіў прапанову назвы Аляксей Герасімюк. Мерапрыемства прысваення назвы калектыву плануецца летам наступнага года.

— Хаця мы ў розным узросце, паміж намі няма падзелаў. Добра складваецца супрацоўніцтва. Спалучае нас ахвота спяваць, любоў да песень, — пацвердзілі найстарэйшыя спевакі Аляксей Герасімюк і Сяргей Кучка яшчэ перад мерапрыемствам, якое мела закончыцца запусным гасцяваннем і супольным спяваннем трох згаданых калектываў. Іх выступы ў перадапошні дзень перад Філіпавым постам паспрыялі завязанню сяброўства паміж спевакамі з Махнатага, Чыжоў і Нараўкі.

— Як на пачатковы перыяд дзейнасці калектыў з Махнатага добра спявае, — заявіў Расціслаў Бялькевіч з „Чыжавян".

— Жанчыны і мужчыны з калектыву цяжка працуюць і робяць вялікія поспехі. Найважнейшае, што з боку спевакоў відаць заангажаванасць. Я бачу вялікую перспектыву, бо ў калектыве многа маладых асоб. Мая задача — як мага найлепш вучыць спевакоў правільнаму спяванню і рыхтаваць да выступаў. Анна Іванюк дбае, каб ансамбль трымаўся беларускага напрамку, а Аляксей Герасімюк стараецца як найлепш займацца арганізацыйнымі справамі, — сказаў мастацкі кіраўнік калектыву Пётр Скепка. — Я зараз падбіраю рэпертуар пад мастацкія магчымасці калектыву. Марыю Мароз, якая сёння выступіла сола, вучу спяваць неапрацаваныя фальклорныя песні, бо бачу ў яе вялікія вакальныя магчымасці. У ансамблі выступае таксама спявачка з колішніх маладых „Дубін" Дарота Раманюк, што зараз тут замужам.

— Выступаць у калектыве запрасіў мяне Пётр Скепка пасля маіх сольных выступаў у Гайнаўскім доме культуры. Я згадзілася, бо вельмі люблю спяваць. Гэта для мяне адпачынак ад штодзённасці, — сказала Марыя Мароз, якая дазджае на рэпетыцыі і выступы з Новага Беразова.

Перад мерапрыемствам спевакі з Махнатага ўпрыгожылі сцэну народнымі матывамі. Павесілі капы з мясцовымі ўзорамі, прымацавалі да сцэны нізенькі плоцік і павесілі на ім гліняныя гаршкі.

— Мы спяваем у галоўным беларускія песні пад акампанемент акардэона. Свой калектыў лічым беларускім, але хочам развучыць таксама песні на іншых мовах, каб мець разнародны рэпертуар, — гаварыў Аляксей Герасімюк.

— Мы падбіраем найчасцей песні з вясёлым зместам, каб развесяліць публіку, — сказалі спевакі з Махнатага.

Хочуць яны пашыць сабе касцюмы, бо зараз выступаюць у сваёй вопратцы. Дзеля гэтага хочуць калядаваць.

— Разважалі мы нават, каб у Махнатым заснаваць танцавальны калектыў, да якога можна было б запрасіць маладых людзей з суседніх вёсак. Але з гэтым можа быць складана, бо зараз мала моладзі засталося ў сёлах, — гаварыў Аляксей Герасімюк.

Пётр Скепка дадаў, што ў бліжэйшым часе махнацкі ансамбль будзе рыхтавацца да калядавання па хатах і на сцэне, а таксама да фестывалю „Беларуская песня".



ISSN 0546-1960